ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
7 ЛЮТАГА 2013 г. ЧАЦВЕР № 24 (27389) Кошт 1300 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Знаёмцеся: Ніна Балашэнка — малады беларускі навуковец са шчырай і прыгожай усмешкай, незвычайным хобі і важнай здольнасцю — не проста разважаць пра навуку, але і займацца ёю ўсур'ёз.**



**Пры той шматлікасці прафесій, якія прапануюць сёння навучальныя ўстановы, цяжка не разгубіцца нават даросламу. А што ўжо казаць пра падлеткаў? Як не памыліцца з выбарам прафесіі?**

## *ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір МАКАРАЎ, прэс-сакратар галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны:**

***«Ставіцца пытанне такім чынам: якая армія лепшая — па найме (цалкам на кантрактнай аснове), армія, у якой прысутнічаюць элементы тэрміновай службы, ці тая, якая цалкам камплектуецца на аснове ўсеагульнага воінскага абавязку? Мяркую, што тая, якая лепш выконвае баявыя задачы, звязаныя з забеспячэннем ваеннай бяспекі. У агляднай будучыні ў Беларусі захаваецца змешаны прынцып камплектавання войска. Сёння беларуская армія налічвае каля 65 тыс. чалавек, а суадносіны кантрактнікаў і салдат тэрміновай службы складаюць прыкладна 60% і 40%».***

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | 0° |
| Віцебск | +1° |
| Гомель | +1° |
| Гродна | 0° |
| Магілёў | +1° |
| Мінск | +1° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 07.02.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8680,00 | ■ |
| Еўра | 11770,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 289,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1065,88 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.




У рамках выставы-кірмашу прайшла прэзентацыя факсімільнага выдання Полацкага Евангелля.

# КНІГІ ТУТ!

**У 2013 годзе Мінская міжнародная выстава-кірмаш праходзіць у 20-ы раз. А гэта ўжо круглая дата. Тым больш што з кожным годам выстава пашыраецца, павялічваецца. Сапраўдны калейдаскоп падзей і мерапрыемстваў. Можна нават сказаць, што гэта своеасаблівы, самы буйны кніжны атракцыён Беларусі, які ладзіцца раз на год і збірае шмат розных выданняў: кнігі, за якія хочацца змагацца; кнігі, якія дапамагаюць жыць. А яшчэ выстава збірае аўтараў.**

**— Беларусь годна завяршае Год кнігі. 2012 год — гэта год знакавых праектаў. Гэта больш за 11 тысяч найменняў кніг тыражом звыш 34 мільёнаў экзэмпляраў, — адзначыла на адкрыцці кніжнай выставы першы намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Лілія АНАНІЧ. — Беларусь пацвярджае статус краіны, якая чытае, якая выбрала свой шлях і разам з усім светам накіравана ў будучыню. Беларускія кнігавыдаўцы падрыхтавалі вялікую кніжную праграму. Мы спадзяёмся, што гэтыя дні будуць плённыя для новых выдавецкіх праектаў. Толькі што мы прадставілі тут першую кнігу беларускага народа — рукапісную кнігу XII стагоддзя Полацкае Евангелле. Нам вельмі прыемна, што беларускае кнігавыданне цэніцца сусветнай кніжнай грамадскасцю.**

СТАР. 4

■ Уражанні

## ПРОСТАЙ МОВАЙ...

...Вельмі правільна заўважыла спадарыня Балошка з Мінска («Звязда», 19 студзеня): адзін з найлепшых момантаў мінулага года — сустрэча з кнігай «Каб сказаць... І пачулі»! Шмат гадоў таму я адкрыла для сябе такую няпростую «Простую мову» Валянціны Доўнар. І менавіта яна, гэта аўтарская рубрыка, «прывязала» мяне да газеты, да роднай мовы, спарадзіла жаданне і самой нешта напісаць. У тым ліку вершы...

СТАР. 4

■ Парламенцкія сустрэчы

## БАЦЬКІ І ДЗЕЦІ

### Погляд на вечны канфлікт з боку заканатворцы

**Нагода для размовы з дэпутатам Палаты прадстаўнікоў Наталляй КУЧЫНСКАЙ аказалася невясёлай. На працягу некалькіх апошніх месяцаў беларуская грамадскасць узрушана жахлівымі паведамленнямі: дзеці гінуць ад рук уласных бацькоў. Следчы камітэт расследуе 4 падобныя забойствы. Немагчыма было абысці гэтую цяжкую тэму ў размове з «карэннай» настаўніцай і нядаўнім начальнікам раённага аддзела адукацыі, з чалавекам, які ўсё сваё жыццё звязаў з дзецьмі.**

*— Наталля Генадзьеўна, ці не лічыце вы, што трагедыі, якія адбываюцца з дзецьмі ва ўласных сем'ях, сігналізуюць пра неабходнасць нейкіх змен у нашым заканадаўстве? Напрыклад, пра тое, што трэба прадугледзець магчымасць «падкінуць» дзіця дзяржаве — каб, як ні цынічна гучыць, папярэдзіць яго забойства?*

— Не думаю, што справа ў заканадаўстве. Не лічу, што яно надта жорсткае і не пакідае жанчыне ў складанай сітуацыі права выбару. Чатыры гады я ўзначальвала аддзел адукацыі, і ў мае абавязкі ўваходзіла абарона правоў і інтарэсаў непаўналетніх дзяцей. Наўрад ці з'яўленне «вокнаў жыцця» — магчымасці ананімна пакінуць дзіця дзяржаўным сацыяльным службам — выключыць падобныя страшныя выпадкі. Справа ў тым, што гора-бацькамі рухаюць не нейкія цяжкія абставіны, а... адсутнасць пачуцця адказнасці за дзіця. Гэта сведчанне дэградацыі асобы. Забойства не ўласціва чалавечай прыродзе, тым больш жанчыне. Тым больш — забойства ўласнага дзіцяці.

Калі я працавала з «абавязанымі» бацькамі, то ў іх заліхтых алкаголем вачах не бачыла нават думкі пра тое, што яны робяць нешта дрэннае. А выпадкі былі вельмі страшныя. Напрыклад, каб дзіця спала, у рот яму клалі кавалак змочаны ў гарэлцы ваты...

СТАР. 2

■ Сітуацыя

## СТАЛІЧНЫЯ РЭАЛІІ: АБМЯРКОЎВАЕМ УШЧЫЛЬНЕННЕ

**Мінск працягвае ўшчыльняцца. Што рабіць, амаль двухмільённы горад развіваецца, і спыніць гэты працэс немагчыма... Сталіца патрабуе новых аб'ектаў — грамадскіх, жылых, дзелавых... Але практычна ўсе прапановы па іх будаўніцтве пачалі сутыкацца з негатыўным стаўленнем з боку гараджан. Іх можна зразумець на абывацельскім узроўні. Людзі пачынаюць абурацца, калі гаворка заходзіць аб ушчыльненні існуючай забудовы. Хоць часцей за ўсё іх пазіцыя зводзіцца да простых аргументаў «мы не хочам» і «нам не падабаецца».**

Гарадскія ўлады сёння прадугледжваюць удзел грамадскасці ў абмеркаванні кожнага інвестыцыйнага праекта. Вось толькі ці заўсёды яно праходзіць у канструктыўным ключы? Часцей за ўсё грамадскія абмеркаванні зводзяцца да спрэчкі, у якой ніводзін з бакоў ужо не чуе другога. Нядаўна адміністрацыя Партызанскага раёна сталіцы арганізавала сустрэчу насельніцтва з заказчыкам і архітэктарам шматфункцыянальнага культурна-забаўляльнага цэнтра Park Avenue на скрыжаванні вуліц Першамайскай — Пуліхава, які плануецца пабудаваць на месцы няспраўнага фантана. Але мясцовыя жыхары, што прыйшлі на яе, выступілі супраць любога будаўніцтва ў зялёнай зоне і цяпер збіраюць подпісы пратэсту.

Наколькі гэта акажацца дзейсным? І як «граматна» пратэставаць, калі вы лічыце, што новы праект сапраўды недарэчны і будзе пабудаваны з парушэннямі горадабудаўнічых нормаў? Мы гутарым аб гэтым з **начальнікам аддзела горадабудаўніцтва і архітэктуры адміністрацыі Партызанскага раёна г. Мінска Мікалаем КАЦЭВІЧАМ.**

СТАР. 3

# БАЦЬКІ І ДЗЕЦІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Справа не ў законе. Такія маці наўрад ці задумваюцца пра тое, ці цяжка ім утрымліваць дзіця. Магчымасць адмовіцца ад немаўляці застаецца і зараз. Дзяцей пакідаюць у радзільных дамах, забываюць пра іх у прытулках... Калі бацькі выпраўляюцца, дзяржава часта ідзе насустрач і спісвае пазыку за часовае ўтрыманне дзяцей у сацыяльных установах. Упэўнена, казаць: дзеці, маўляў, гінуць з-за таго, што дзяржава абавязвае бацькоў іх утрымліваць, — неправамерна.

**— А калі справа не ў алкаголі і безадказнасці? Калі прычына — у дэпрэсіі, у псіхалагічна складанай сітуацыі? У нас забяспечана дапамога маці і абарона дзяцей у гэтых выпадках?**

— Не магу сказаць. З такім у сваёй практыцы не сутыкалася. Больш мела справы са школьнікамі. І вось тут магу зрабіць вынік пра наступную тэндэнцыю ў нашым грамадстве: усё часцей бацькі перакладаюць свае абавязкі па выхаванні дзяцей на школу. І закон тут, напэўна, занадта мяккі.

**— Напрыклад?**

— Калі з дзіцем адбылася бяда, то пытаюцца ў першую чаргу не з сям'і, а са школы: ці наведвала дзіця гурткі, ці ўдзельнічала ў грамадскім жыцці, якую работу праводзіў класны кіраўнік? Напрыклад, толькі нядаўна з'явілася наступная заканадаўчая норма: бацькоў, дзеці якіх у позні час знаходзяцца без догляду, штрафуюць.

Неабходна павышаць адказнасць бацькоў за дзяцей, за іх выхаванне, за іх бяспеку і шчасце.

**— І з чаго трэба пачынаць?**

— З выкаранення сацыяльнага спажывальніцтва. Пазіцыя «Дайце мне!», на жаль, уласцівая грамадству, у тым ліку і моладзі. Сутыкалася з юнымі мамамі і татамі, якія, прывёўшы дзіця ў садок, зыходзілі з пазіцыі «дай» і толькі патрабавалі. Яны лічаць, што ўвесь свет створаны для іх, добра ведаюць правы ды часам забываюць пра свае абавязкі. Пачынаецца з уладкавання дзіцяці ў садок, а заканчваецца жыллём, магчымасцю матэрыяльнай дапамогі, адносінамі з суседзямі, працаўладкаваннем...

Нядаўна да мяне прыйшла маці пяці дзяцей, каб удакладніць, ці ёсць магчымасць шматдзетнай сям'і купіць машыну па льготным крэдыце, бо для іх машына — не раскоша, а неабходны сродак перамяшчэння. На жаль, закон такой магчымасці не прадугледжвае.



**Наталля КУЧЫНСКАЯ (трэцяя злева) з бацькамі і выхаванцамі Дзіцячага дома сямейнага тыпу Наталлі і Аляксандра ЯКІМЕНКАЎ (Ашмяны) і са сваім памочнікам, дырэктарам СШ №1 г. Ашмяны Міхаілам ГРУЖЭЎСКІМ (першы справа).**

З падобным пытаннем (пра транспарт) да мяне звярталіся і бацькі — выхавацелі дзіцячага дома сямейнага тыпу. Я адрасавала пытанне намесніку прэм'ер-міністра: «Ці магчыма камплектаванне дзіцячых дамоў сямейнага тыпу мікрааўтобусамі?» Са мной згадзіліся, што такая праблема сапраўды існуе і яе вырашэнне патрабуе дадатковага вывучэння. У адказе было падкрэслена, што мэтазгодна яе вырашаць на ўзроўні мясцовых улад.

На маю думку, буйныя беларускія прадпрыемствы таксама маглі б дапамагчы з забеспячэннем дзіцячых дамоў сямейнага тыпу транспартам.

**— Шчасце дзяцей звязана з сямейным шчасцем іх бацькоў, аднак колькасць разводаў у нашай краіне працягвае расці. Якім чынам, на ваш погляд, можна было б паўплываць на гэтую сітуацыю?**

**Безумоўна, я выступаю за адказнасць уладальнікаў інтэрнэт-сайтаў. Тут наша заканадаўства сапраўды недапрацоўвае.**

Але перш чым патрабаваць ад людзей, ад грамадства, задай сабе пытанне: «Што я зрабіў для людзей?»

Трэба пачынаць з выхавання ўнутранай культуры. З павагі да настаўніка, з яго аўтарытэту і для бацькоў, і для дзяцей.

*— Вы ўжо пэўны перыяд адпрацавалі дэпутатам, прымалі людзей, выслухоўвалі іх просьбы... Гэта дадало да вашага досведу новыя разважанні на гэтую тэму?*

— Часам здаецца, што тыя самыя людзі і з тымі ж самымі праблемамі прыходзілі да мяне і раней. Напэўна, у гэтым спецыфіка невялікіх раёнаў: да начальніка аддзела адукацыі ідуць са шматлікімі пытаннямі. І як дэпутат сутыкнулася з вырашэннем самых розных жыццёвых абставін.

— Мы маем сур'ёзную праграму дэмаграфічнай бяспекі, нам удаецца паляпшаць якасць жыцця, змяншаць колькасць дзіцячых смерцяў... Аднак нам трэба яшчэ сур'ёзна падумаць аб павышэнні прэстыжу сям'і і шчырых сямейных адносінах. Трэба, каб добрыя сем'і былі вылучаны не толькі ў школе, але і на вытворчасці. Моцныя сем'і, якія адказна ставяцца да выхавання дзяцей, неабходна прапагандаваць, падтрымліваць, заахвочваць, рабіць іх прыкладам.

У Ашмяншчыны ёсць пэўны досвед у гэтым. Калі мы віталі ў раёне пераможцаў школьных алімпіяд, на ўрачыстасць заўсёды запрашалі разам з вучнем яго настаўніка і бацькоў. І вучань, і настаўнік, і бацькі атрымлівалі граматы і чулі словы падзякі ў свой адрас. З аднаго боку, дзіця адчувала, што за яго поспехам стаіць праца цэлай каманды. З другога, такім чынам падкрэслівалі каштоўнасць сям'і і бацькоўскага выхавання, дзякуючы якому і атрымаўся добры вынік.

Дарэчы, на школьнай дошцы пашаны практычна ва ўсіх установах адукацыі побач са здымкамі вучняў-выдатнікаў змяшчаем і партрэты іх настаўнікаў і бацькоў. Мы ўвогуле стараліся як мага часцей аб'ядноўваць сем'і: у паходах, на канферэнцыях, конкурсах...

Трэба выхоўваць грамадства на пазітыве. Думаю, калі СМІ пачнуць масава і мэтазгодна рэкламаваць пазітыўны вопыт бацькоўства, «піярыць» поўныя, добранадзейныя і моцныя сем'і, гаварыць пра каштоўнасць шчырых сямейных адносін, то для краіны і грамадства вынік будзе станоўчы. Тут можа быць вельмі плённым і супрацоўніцтва з традыцыйнымі рэлігійнымі арганізацыямі. Часам аўтарытэт святара вышэй за аўтарытэт чыноўніка. Трэба аб'ядноўваць намаганні грамадства і дзяржавы, падключаць старэйшае пакаленне, абапірацца на культуру.

**Сутыкалася з юнымі мамамі і татамі, якія, прывёўшы дзіця ў садок, зыходзілі з пазіцыі «дай» і толькі патрабавалі. Яны лічаць, што ўвесь свет створаны для іх...**

**— У сваёй перадвыбарнай праграме вы прапаноўвалі ўвесці адказнасць уладальнікаў інтэрнэт-сайтаў за прапаганду дэструктыўных паводзін сярод дзяцей і моладзі. Вы маеце на ўвазе інтэрнэт-цэнзуру?**

— Гэта можа быць і цэнзура. Мяне вельмі хвалюе, што дзеці пад уздзеяннем інтэрнэту прымаюць рашэнні зыходу з жыцця, што яны не абаронены ад разбуральнага ўздзеяння глабальных сетак. Наша з вамі псіхіка, выхаваная на добрых савецкіх фільмах, класічнай літаратуры і павазе да бацькоўскага слова, больш моцная, чым псіхіка сучасных тынейджараў. У нас у дзяцінстве быў закладзены моцны фундамент і цвёрдае разуменне, «что такое хорошо и что такое плохо». Мы здольныя адрозніць добрае ад кепскага, а сённяшнія дзеці — не заўсёды. Ім не хапае маральнага стрыжня, каб супрацьстаяць разбуральнаму ўздзеянню негатыўнай інфармацыі, якая льецца з тэлеэфіру, прэсы і інтэрнэт-прасторы.

Безумоўна, я выступаю за адказнасць уладальнікаў інтэрнэт-сайтаў. Тут наша заканадаўства сапраўды недапрацоўвае. Сёння выхоўвае не толькі школа і не толькі сям'я — сёння выхоўвае асяроддзе. І часам віртуальнае асяроддзе мае больш значны ўплыў на дзіця, чым рэальнае. Мы, дарослыя, павінны абараніць нашых дзяцей ад яго негатыўнага ўплыву.

**— Амаль усё ваша жыццё да працы ў парламенце было звязана са школай. Якія праблемы ў сферы адукацыі вас хвалююць?**

— Хвалюе, што, атрымаўшы агульную сярэднюю адукацыю, сучасны выпускнік часта мае мазаічныя, а не сістэмныя веды, не заўсёды навучаны самастойна пераадольваць інтэлектуальныя цяжкасці. Перажываю, што ў 10 клас не заўсёды ідуць матываваныя на вучобу дзеці і школьным настаўнікам прыходзіцца няньчыць фанвізінскіх недарасляў.

Хацелася б, каб урокі нашых настаўнікаў былі сапраўды сучаснымі — гэта значыць, развіваючымі і карыснымі для дзіцяці. Добра, што на дзяржаўным узроўні пачаліся пэўныя зрухі ў павышэнні прэстыжу педагагічнай прафесіі. Таму спадзяюся, што ў педагагічныя ўстановы вышэйшай адукацыі будуць паступаць толькі па прызванні.

На мой погляд, ёсць патрэба і ў распрацоўцы крытэрыяў і паказчыкаў для вызначэння якасці адукацыі. Каб бацькі ведалі: якасную адукацыю атрымлівае іх дзіця або не. Каб само дзіця адчувала, наколькі якасна яно адукаванае і выхаванае, і задумвалася, што многае залежыць ад яго асабістых намаганняў. Размова не пра адзнаку. Бо адзнака — рэч суб'ектыўная. Згодна з меркаваннем, каб экзамены за курс базавай школы прымалі незалежныя эксперты.

Ну і, безумоўна, праблемы ў грамадстве, з якіх мы распачалі размову, не стаяць у баку ад адукацыі. Школа, хоць і не павінна падмяняць сям'ю, але адыгрывае важную ролю ў фарміраванні асобы. Калі класны кіраўнік і дырэктар (а гэта вельмі значныя постаці ў выхаванні!) будуць менш загружаны папяровай работай і галоўную ўвагу нададуць канкрэтнаму дзіцяці; калі бацькі і настаўнікі асэнсуюць, што яны супрацоўнікі і аднолькава хочуць, каб дзеці сталі людзьмі і дабіліся жыццёвага поспеху; калі мы навучым дзяцей разумець, што асновай поспеху з'яўляюцца ўласныя намаганні, а не пазіцыя «дай», — тады і разбуральным тэндэнцыям нашага часу супрацьстаяць будзе лягчэй.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## УЛАДЗІМІР МАКЕЙ І СЯРГЕЙ ЛАЎРОЎ АБМЕРКАВАЛІ ПЫТАННІ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ БЕЛАРУСІ І РАСІІ НА МІЖНАРОДНАЙ АРЭНЕ

**Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей учора на сустрэчы ў Маскве з міністрам замежных спраў Расійскай Федэрацыі Сяргеем Лаўровым абмеркаваў шырокае кола пытанняў двухбаковага ўзаемадзеяння. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага знешнепалітычнага ведамства.**

У прыватнасці, былі разгледжаны пытанні правядзення ў гэтым годзе пасяджэнняў кіруючых органаў Саюзнай дзяржавы, удасканалення функцыянавання Адзінай эканамічнай прасторы і руху да стварэння Еўразійскага эканамічнага саюза. Акрамя таго, бакі абмеркавалі ўзаемадзеянне паміж Беларуссю і Расіяй на міжнароднай арэне, у тым ліку ў міжнародных арганізацыях, развіццё двухбаковага супрацоўніцтва ў эканамічнай і гуманітарнай сферах.

Асаблівую ўвагу кіраўнікі знешнепалітычных ведамстваў дзвюх краін удзялілі актуальным пытанням узаемадзеяння паміж міністэрствамі замежных спраў, уключаючы правядзенне да канца гэтага года сумеснага пасяджэння калегій МЗС Беларусі і Расіі.


## ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

| | |
|---|---|
| Наименование (описание) имущества и стоимость | **Лот № 1.** Капитальное строение инв. № 200/С-81240 (здание центрального склада) общей площадью 194,3 кв. м, одноэтажное кирпичное здание с кирпичными стенами и железобетонными перекрытиями, 1979 года постройки условный земельный участок с кадастровым номером 240100000002007001, площадью 468 $м^2$. Местонахождение объекта: г. Витебск, ул. Ленинградская, д. 170, корп. 1. Капитальное строение инв. № 200/С-81239 (здание дома быта) общей площадью 279,3 кв. м, одноэтажное здание со сборно-щитовыми стенами и деревянными перекрытиями, условный земельный участок с кадастровым номером 240100000002007001, площадью 706 $м^2$. Местонахождение объекта: г. Витебск, ул. Ленинградская, д. 170. Имеется доступ автомобильного транспорта. Начальная стоимость лота 342 036 000 рублей. |
| **Собственник (владелец) имущества** | **КУП ОБУ «Витрайбыт» (г. Витебск, ул. Ленинградская, 4, УНП 300064006)** |
| **Наличие обременений** | **Залог ОАО «Белинвестбанк»** |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | **Хозяйственный суд Витебской области г. Витебск, ул. «Правды», 32 19 февраля 2013 года в 11.00** |
| **Справочная информация** | Хозяйственный суд Витебской области 210101, г. Витебск, ул. «Правды», д. 32, каб. 324 http:// vitebsk.court.by Судебный исполнитель Деревнин Сергей Евгеньевич, тел./факс: 80212491342, 80291502410 Старший судебный исполнитель Зуев Михаил Евгеньевич, тел. 80212491343 |
| **Условия и порядок проведения торгов** | 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества на депозитный счет хозяйственного суда Витебской области № 3642903002094 в 200 филиале ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Витебск, код 635, УНН 300007670 **не позднее 11.00 19.02.2013.** Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. |



**Открытое акционерное общество**

## «Дорожно-строительный трест № 3»

**СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ, которое состоится 19 февраля 2013 года в 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.**

**Повестка дня:**

1. О внесении изменений в Устав ОАО «ДСТ № 3»

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться **19.02.2013 г. с 14.00 до 14.45 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.**

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — **07.02.2013 г.**

Лицам, имеющим право на участие в собрании, можно ознакомиться с материалами к собранию по адресу: **г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 40.**

Лицам, имеющим право на участие в собрании, при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров — доверенности, зарегистрированные в соответствии с «Инструкцией о порядке регистрации доверенностей, предусматривающих передачу прав, удостоверенных акциями», утвержденной постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 30.08.2006 г. № 1093).

**Справки по телефонам:**
**28 40 20, 23 64 87 — Отдел правовой и кадровой работы.**

*Наблюдательный совет.*

УНП 700049607

# СТАЛІЧНЫЯ РЭАЛІІ: АБМЯРКОЎВАЕМ УШЧЫЛЬНЕННЕ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

— Правядзенне грамадскага абмеркавання рэгулюецца ***пастановай Савета міністраў № 687 «Аб парадку правядзення грамадскіх абмеркаванняў у галіне архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці»***, — тлумачыць Мікалай Кацэвіч. — У адпаведнасці з гэтым палажэннем, пасля таго, як інвестар падаў заяўку, адміністрацыяй раёна ствараецца камісія, якая павінна паведаміць жыхарам пра тое, што рыхтуецца грамадскае абмеркаванне. Гэта павінна быць зроблена не менш чым за 10 дзён да яго пачатку. Інфармацыя публікуецца ў СМІ. У нашым выпадку мы апублікавалі яе ў «Вячэрнім Мінску», «Мінскім кур'еры» і «МТЗ-аглядзе», а таксама вывесілі паведамленне на сайце Мінгарвыканкама. Больш за тое, мы расклеілі аб'явы на пад'ездах. («Мы ж ведаем, з кім звязваемся», — цяжка ўздыхае наш суразмоўца.)

У вестыбюлі нашай адміністрацыі таксама была размешчана ўся неабходная інфармацыя аб аб'екце, ляжаў журнал для водгукаў і прапаноў. Кожны ахвотны мог пакінуць у ім сваё меркаванне аб праекце. Усё гэта будзе ў далейшым адлюстравана ў пратаколе.

На грамадскае абмеркаванне, акрамя жыхароў раёна, мы запрасілі заказчыка, інвестара і распрацоўшчыка канцэпцыі будаўніцтва гэтага аб'екта. Яны распавялі людзям аб праекце.

**— Наколькі плённа праходзіла абмеркаванне? Ці ўсё, як звычайна, вылілася ў адны эмоцыі?**

— Мы стараемся, каб гэта праходзіла арганізавана. Усталёўваецца рэгламент, мы заклікаем бакі прыслухоўвацца да аргументаў адзін аднаго.

Распрацоўшчык канцэпцыі распавядае пра яе, аб асноўных аб'ёмах і кірунках будаўніцтва згодна з генпланам. Затым, калі ёсць такія пажаданні, выступае інвестар. Далей ідуць пытанні да іх. Хоць, вядома, звычайна розныя воклічы і крыкі чуваць ужо з самага пачатку абмеркавання. Тым не менш мы спрабуем весці абмеркаванне ў канструктыўным рэчышчы.

Калі жыхары прыходзяць з намерам пачуць — гэта адно. Але часта такога не назіраецца. Людзі з самага пачатку ўсё вырашылі для сябе, перакананыя ў тым, што гэты аб'ект ім не патрэбен, і не жадаюць чуць ніякіх аргументаў. Але, калі бачыш, што крыкам нічога не возьмеш, тады некаторыя пачынаюць ісці на кантакт і ўносіць свае прапановы.

**Калі жыхары прыходзяць з намерам пачуць — гэта адно. Але часта такога не назіраецца. Людзі з самага пачатку ўсё вырашылі для сябе, перакананыя ў тым, што гэты аб'ект ім не патрэбен, і не жадаюць чуць ніякіх аргументаў.**

Мы даводзім да людзей: калі з горадабудаўнічай дакументацыі вынікае, што ўсё адпавядае нарматывам, то аб'ект мае права на рэалізацыю. І людзі не могуць патрабаваць адмены будаўніцтва. Бо гарадская зямля — не іх прыватная ўласнасць. Але мы прапануем уносіць свае заўвагі і прапановы па аб'екце і абяцаем улічыць іх.

❍ ❍ ❍

— Каб быць выслуханымі, не варта апускацца да эмоцый, — раіць Мікалай Кацэвіч. — Лепш аргументавана вылучаць свае пярэчанні і ўносіць канструктыўныя прапановы, калі яны маюцца. Эмоцыі прымацца да ўвагі не будуць — толькі аргументы. Усе прапановы мы запісваем. Цалкам магчыма, што яны дапамогуць скарэктаваць праект у лепшы бок. Не будуць улічвацца толькі тыя прапановы, якія ідуць уразрэз з горадабудаўнічымі нормамі.

Усё, што адбываецца на грамадскім абмеркаванні, будзе адлюстравана ў пратаколе, які мы адправім у вышэйшую інстанцыю, у нашым выпадку — у Мінгарвыканкам, для прыняцця рашэння. Таму што інвестыцыйны дагавор будзе падпісвацца Мінгарвыканкамам. Раённая адміністрацыя — толькі арганізатар грамадскага абмеркавання. Яна даводзіць да насельніцтва намеры інвестара.

**— Вы прадбачылі рэакцыю гараджан?**

— Негатыў прадбачыўся. Мы і так трохі скарацілі аб'ект. Пакуль ён яшчэ ў сырым выглядзе, не дапрацаваны. Ён павінен яшчэ ўдасканальвацца. У прыватнасці, павінны быць прадугледжаны гасцявыя аўтастаянкі... Пакуль гэта эскізны варыянт.

**— Наколькі правамоцна выносіць на абмеркаванне сыры, яшчэ не дапрацаваны праект?**

— Гэта прадугледжана пастановай Саўміна «Аб парадку правядзення грамадскіх абмеркаванняў у галіне архітэктурнай, горадабудаўнічай і будаўнічай дзейнасці». На гэтай стадыі, каб інфармаваць людзей, гэтага дастаткова. Таму што прымусіць інвестара цалкам распрацоўваць праект перад грамадскім абмеркаваннем — значыць загнаць яго ў такія рамкі кошту праекта, што гэта будзе непрымальна для яго. Гэта вельмі дорага.

**— Як будуць развівацца падзеі далей?**

— Калі Мінгарвыканкамам будзе заключаны інвестыцыйны дагавор, пачне распрацоўвацца будаўнічы праект, праектная дакументацыя, пройдзе экспертыза аб'екта. На экспертызу будуць прадастаўлены і пратаколы грамадскага абмеркавання.

**— Значыць, спачатку гараджане павінны даць сваю згоду, а праект будзе ацэньвацца з пункту гледжання адпаведнасці нарматывам пазней? А калі нейкая з службаў не дапрацуе? Як пра гэта могуць даведацца людзі? У цэлым, адкуль яны будуць чэрпаць інфармацыю аб тым, адпавядае аб'ект нарматывам ці не?**

— Як правіла, людзі ў такіх выпадках ідуць да канца. Яны пішуць запыты, скаргі, а мы даём адказы, што зроблена, як і чаму, у тым ліку прыводзім даныя экспертызы.

**— Усё-такі меркаванне простых гараджан пры ўшчыльненні забудовы ўлічваецца?**

— Так. У палажэнні ўсё выразна прадугледжана, у тым ліку і варыянт уліку грамадскай думкі з дапамогай цывілізаваных падыходаў. У прыватнасці, у ім гаворыцца, што калі прынята рашэнне аб заключэнні інвестыцыйнага дагавора і праектная дакументацыя прайшла экспертызу, але жыхары настроены супраць будаўніцтва аб'екта, то яны могуць правесці незалежную экспертызу, якая дасць сваё заключэнне. І далей спрэчка вырашаецца ў судовым парадку. Калі будзе даказана, што ўшчыльненне парушае нейкія будаўнічыя нарматывы, то суд цалкам рэальна выйграць. А вось эмоцыі, мітынгі і зборы подпісаў супраць ушчыльнення не з'яўляюцца важкімі аргументамі.

**Святлана БУСЬКО.**


## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**строительства многоквартирных жилых домов типовых потребительских качеств №№ 9, 11 (по генплану) со встроенно-пристроенными помещениями в жилом квартале в границах ул. Янковского – ул. Горецкого – ул. Проектируемой в г. Минске. Жилой дом № 9 по генплану.**

Данная проектная декларация отменяет действие проектной декларации строительства многоквартирных жилых домов типовых потребительских качеств №№ 9, 11 (по генплану) со встроенно-пристроенными помещениями в жилом квартале в границах ул. Янковского – ул. Горецкого – ул. Проектируемой в г. Минске. Жилой дом № 9 по генплану, опубликованной в газете «Республика» 17 ноября 2012 г. (№ 218 (5633))

**Информация о Застройщике**

**Общество с ограниченной ответственностью «Минтехнострой» (ООО «Минтехнострой»).**

**Место нахождения:** г. Минск, ул. Сторожевская, д. 8, пом. 11.

**Режим работы:** понедельник – пятница с 9.00 до 18.00, обеденный перерыв с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

**Государственная регистрация застройщика:** Общество с ограниченной ответственностью «Минтехнострой» зарегистрировано Минским городским исполнительным комитетом 16 марта 2009 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191151455.

В проектах строительства жилых домов и иных объектов недвижимости в течение трех лет, предшествующих заключению договора, ООО «Минтехнострой» участие не принимало.

**Информация о проекте**

**Цель проекта:** строительство панельного многоквартирного жилого дома в г. Минске, в жилом квартале в границах ул. Янковского – ул. Горецкого – ул. Григория Ширмы.

**Срок реализации проекта:** 1 квартал 2012 г. – 3 квартал 2013 г.

**Государственная экспертиза проектной документации:** экспертное заключение № 375–60/11, выданное 20.05.2011 г. Республиканским унитарным предприятием «Главгосстройэкспертиза».

**Местонахождение строящегося многоквартирного жилого дома:** г. Минск, жилой квартал в границах ул. Янковского – ул. Горецкого – ул. Григория Ширмы.

**Характеристика строящегося многоквартирного жилого дома:** крупнопанельный 18-этажный с техподпольем, односекционный, 112-квартирный жилой дом в конструкциях серии М 111–90 с помещениями товарищества собственников и встроенными офисными помещениями. Количество квартир в доме – 112, в том числе: однокомнатных – 48 ед., двухкомнатных – 48 ед., трехкомнатных – 16 ед. Отделка квартир, предназначенных для коммерческой реализации, не выполняется. Наружная отделка – покраска фасадными красителями, покрытие ЗДПС, облицовка плиткой (крыльцо). Высота этажа – 2,8 м. В каждой квартире есть летние помещения – остекленные лоджии. В доме предусмотрен мусоропровод и два лифта грузоподъемностью 400 кг и 630 кг. Схема системы отопления – двухтрубная горизонтальная, с прокладкой металлопластиковых трубопроводов в гибкой гофрированной трубе в конструкции пола. Проектом предусматривается автоматизация учета тепловой энергии, регулирование температуры теплоносителя, управление задвижкой канализационного выпуска. Для телефонизации объекта предусматривается построение пассивной оптической сети, обеспечивающей возможность подключения телефонных аппаратов и высокоскоростного интернета. Распределительную сеть предусматривается выполнить модульными волоконно-оптическими кабелями от распределительного шкафа, устанавливаемого на первом этаже здания.

**Цены на объекты долевого строительства:**
однокомнатные квартиры – **10 500 000** рублей за 1 кв.м общей площади;
двухкомнатные квартиры – **10 000 000** рублей за 1 кв.м общей площади;
трехкомнатные квартиры – **9 500 000** рублей за 1 кв.м общей площади.

**Условия оплаты:** уплата цены объекта долевого строительства производится дольщиком единовременно не позднее 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации договора создания объекта долевого строительства в местном исполнительном и распорядительном органе. По соглашению сторон, уплата цены объекта долевого строительства может быть произведена дольщиком поэтапно в установленный договором период по графику платежей. По соглашению сторон, дольщику может быть предоставлена скидка от общей стоимости квартиры.

**Количество предлагаемых объектов долевого строительства**: 15 единиц.

**Права застройщика на земельный участок:** решение Минского городского исполнительного комитета от 8 декабря 2011 г. № 3730 «О предоставлении земельного участка».

Свидетельство (удостоверение) № 500/986 – 5101 о государственной регистрации земельного участка с кадастровым номером 500000000006006397, расположенного по адресу: г. Минск, в границах ул. Янковского – ул. Горецкого – ул. Проектируемая, площадь – 0,7396 га, назначение – Земельный участок для строительства объекта «Строительство многоквартирных жилых домов типовых потребительских качеств №№ 9, 11 (по генплану) со встроенно-пристроенными помещениями в жилом квартале в границах ул. Янковского – ул. Горецкого – ул. Проектируемой. Жилой дом № 9 по генплану», составленного Республиканским унитарным предприятием «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» 14 декабря 2011 г.

Свидетельство (удостоверение) № 500/986 – 5102 о государственной регистрации земельного участка с кадастровым номером 500000000006006398, расположенного по адресу: г. Минск, в границах ул. Янковского – ул. Горецкого – ул. Проектируемая, площадь – 0,1404 га, назначение – Земельный участок для строительства и обслуживания объекта «Строительство многоквартирных жилых домов типовых потребительских качеств №№ 9, 11 (по генплану) со встроенно-пристроенными помещениями в жилом квартале в границах ул. Янковского – ул. Горецкого – ул. Проектируемой. Жилой дом № 9 по генплану», составленного Республиканским унитарным предприятием «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» 14 декабря 2011 г.

**Границы земельного участка:** улица Янковского – улица Горецкого – улица Григория Ширмы.

**Площадь земельного участка:** земельный участок для строительства объекта – 0,7396 га, земельный участок для строительства и обслуживания объекта – 0, 1404 га.

**Элементы благоустройства:** вся территория участка застройки благоустраивается и озеленяется. Пешеходные дорожки и тротуары выполняются из мелкоразмерной тротуарной бетонной плитки.

**Функциональное назначение нежилых помещений в многоквартирном жилом доме:** на первом этаже запроектированы офисные помещения (три группы – № 1, № 2, № 3), имеющие самостоятельные входы, помещение товарищества собственников и электрощитовая. В здании запроектировано устройство двух ИТП – для жилой части и для встроенных помещений административного назначения. Подземная часть здания решена с техническим подпольем, где расположены помещения ИТП, водомерной, пожарной насосной.

Межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию многоквартирного дома, поступают в общую собственность дольщиков.

**Предполагаемый срок ввода многоквартирного жилого дома в эксплуатацию:** 31 августа 2013 года.

**Договор генерального строительного подряда:** договор строительного генподряда № 45/05–11 от 23.12.2011 г., заключен Застройщиком с Открытым акционерным обществом «МАПИД».

**Условия ознакомления с объектом долевого строительства:** ознакомиться с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству можно в офисе уполномоченного представителя Застройщика – ЧРУП «Вива Консалт» (торговая марка ViVa Invest), расположенного по адресу: г. Минск, ул. Б. Хмельницкого, д. 7, офис 302 (тел. 8–017–2–900–901, 8–029–1–907–901) или на сайте **vivainvest.by**

# КНІГІ ТУТ!



Стужку перараэаюць (злева направа) старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалай ЧАРГІНЕЦ, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Аляксандр РАДЗЬКОЎ, першы намеснік міністра інфармацыі Беларусі Лілія АНАНІЧ і намеснік кіраўніка Федэральнага агенцтва па друку і масавых камунікацыях РФ Уладзімір КАЗЛОЎ.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Радуюць вока багаты стэнд Ірана, увесь у дарагіх кнігах рэпрадукцый іранскіх мастакоў; мініяцюрныя кнігі Азербайджана, сярод якіх ёсць, напрыклад, «Жалейка» Янкі Купалы; каляровыя і якасныя кнігі з Германіі, Італіі і ЗША. Французскі стэнд наогул здзівіў: велізарны павільён аформлены ў выглядзе бібліятэчнай чытальнай залы. І ў галаве адразу з'яўляюцца асацыяцыі з, вядома ж, авальнай залай старога будынка французскай нацыянальнай бібліятэкі. Пра атракцыён я таксама згадала нездарма. На стэндах Германіі, Польшчы, Расіі і іншых краін-удзельніц плануецца шмат цікавых прэзентацый і сустрэч. Акрамя кніг, таксама ёсць на што паглядзець: напрыклад, запланавана шмат мерапрыемстваў, якія прадстаўляюць культуру розных краін.

Ганаровым госцем сёлетняй кніжнай выставы з'яўляецца Расія. Гэта наклала асаблівую пячатку на прадстаўленні цэлага шэрагу выдавецкіх праектаў. У прыватнасці, «Выдавецкі дом «Звязда» прэзентаваў заснаваную з ініцыятывы Міністэрства інфармацыі краіны серыю кніг «Сугучча сэрцаў». Пад адной вокладкай першай з задуманых 11 кніг — «З думкамі пра Радзіму» — творы беларускіх і расійскіх пісьменнікаў. На працягу 2013 года ў серы пабачаць свет яшчэ 10 зборнікаў, якія пазнаёмяць з нацыянальнай літаратурай краін СНД.

**Зоя СВЕТЛАЯ.**

Фотаздымкі Марыны БЕГУНКОВАЙ.



На стэндзе «Звязды».



Ганаровым госцем ХХ кніжнай выставы-кірмашу ў Мінску стала Расія, а цэнтральным экспанентам — Іран.

# ПРОСТАЙ МОВАЙ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

А вось з фотаапаратам я сябрую даўно. Нават у грыбы без яго не хаджу. Тым больш — на блізкі Днепр...

У любы час сутак, ва ўсе поры года яны — і лес, і рэчка, і вёска, і людзі — розныя, непаўторныя. Але ж каб «злавіць» імгненне, каб зрабіць добры здымак, трэба вельмі многае ведаць і ўлічваць, трэба ўмець зарыентавацца. У звяздоўца Анатоля Клешчука гэта атрымліваецца проста бліскуча! Сведчаннем таму не толькі безліч здымкаў на старонках газеты, якую я чакаю кожны дзень (чаму і не люблю нядзелю з панядзелкам, а тым болей — святы...), але і фотаальбомы. У новым — «Беларусь. Зямля песняроў» — ён з замілаваннем паказвае нам мясціны Купалы і Коласа, а значыць, непаўторнае, непадробнае хараство нашага краю. Уражанне ад кнігі проста незвычайнае! Кожная яе старонка цешыць вочы і сэрца, паляпшае настрой, прымушае неяк па-іншаму бачыць свет...

Таму мяне зусім не здзівіла жаданне сяброўкі менавіта гэты фотаальбом (дарэчы, досыць цяжкі) завезці сваім блізкім у Аўстрыю. Няхай, кажа, і яны паглядзяць, якая ў нас краіна!

Не пашкодзіць гэта і нам — убачыць убачанае майстрам. І пачуць тое, што сказана. У тым ліку — каб злавіць сябе на думцы, што гэтых кніг... мала. Я, напрыклад, буду чакаць новых з «Простай мовай» і... з рэкамі Беларусі. Думаю, што напрацоўкі ў аўтараў ёсць. Значыць, справа за «драбязой» — за выданнем, попыт на якія, упэўнена, будзе.

**Соф'я КУСЯНКОВА,**
*в. Лучын, Рагачоўскі раён.*

**P.S.** *Сёння,* **7 лютага з 11 да 12 гадзін,** *у рамках ХХ міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу, што праходзіць у Нацыянальным выставачным цэнтры «БелЭкспа» (вул. Я. Купалы, 27) адбудзецца прэзентацыя кніг звяздоўцаў Валянціны Доўнар і Анатоля Клешчука.*

**Сардэчна запрашаем!**

## ■ Здарэнні

## ЕЎРА НЕ «ЗНАЙШЛІ» ГАСПАДАРА

**Супрацоўнікі Брэсцкай мытні канфіскавалі ў купэ цягніка «Масква — Парыж» больш за 27 тысяч «нічыйных» еўра.**

Грошы «ехалі» ў адным купэ з 45-гадовым мужчынам, грамадзянінам Расіі, які заявіў, што вязе толькі тавары, якія не трэба дэклараваць, і адмовіўся падаваць мытную дэкларацыю. Праз нейкі час было высветлена, што пасажыр сапраўды мае пры сабе суму, якая не перавышае 10 тысяч долараў, а значыць, дэкларацыя насамрэч не патрабуецца.

27,5 тысячы еўра супрацоўнікі мытні знайшлі ў шафцы для туалетных прылад. Расіянін тлумачыў, што на прыпынках не раз выходзіў з купэ, пакідаючы яго незачыненым, і таму пра паходжанне прыхаваных еўра нічога сказаць не можа. Цяпер валюта канфіскавана да рашэння суда як нічыйная.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ** ■

**Анатоль ТОЗІК:**

# «ШКОЛА — НЕ КАМЕРА ЗАХОЎВАННЯ»

**— «Стаўленне бацькоў і дзяцей да школы трэба карэнным чынам змяняць. Сёння гэта суперактуальная праблема для сістэмы адукацыі, — заявіў на калегіі, дзе падводзіліся вынікі работы адукацыйнай галіны за 2012 год, віцэ-прэм'ер беларускага ўрада Анатоль Тозік. — У кожнага, у рэшце рэшт, павінны быць свае абавязкі: абавязак дзяржавы — стварыць умовы для атрымання адукацыі, а абавязак вучня — скарыстацца дадзенай яму магчымасцю. Настаўнік павінен вучыць, а школьнік павінен вучыцца, і калі той не жадае атрымліваць веды — гэта не клопат настаўніка, і педагог не абавязаны прымушаць школьніка вучыцца любымі спосабамі. Асабліва гэта тычыцца старшакласнікаў. У нас у краіне абавязковая дзевяцігадовая адукацыя, і ў старшыя класы павінны прыходзіць толькі тыя вучні, якія не проста жадаюць, але і могуць засвойваць вучэбную праграму. Трэба змяніць стаўленне бацькоў да школы як да нейкай «адукацыйнай камеры захоўвання». Маўляў, аддаў дзіця і зняў з сябе адказнасць, а далей усё — праблемы толькі школы...**

— У пачатковых класах сёння практыкуецца безадзнакавае навучанне па некаторых прадметах. Я лічу, што нават у першым класе дзіця павінна атрымліваць ацэнку за свае намаганні. У Кітаі ўжо ў першых класах напрыканцы дня вывешваецца рэйтынгавая табліца, дзе можна бачыць, як хто спрацаваў у параўнанні з іншымі. Мяркую, трэба думаць, наколькі канкурэнтаздольнае пакаленне мы росцім, — дадаў Анатоль Тозік.

Звяртаючыся да міністра адукацыі, віцэ-прэм'ер прапанаваў падумаць разам над тым, каб скаардынаваць работу агульнаадукацыйных і дзіцяча-юнацкіх спартыўных школ:

— Трэба спорт і фізічнае выхаванне максімальна перанесці ў агульнаадукацыйныя школы. У нас ужо ёсць станоўчы вопыт функцыянавання ў агульнаадукацыйных школах спецыялізаваных спартыўных класаў. Лічу, што ў тых школах, дзе ёсць свае басейны, можна ствараць спецыялізаваныя класы па плаванні. Або ствараць спецыялізаваныя класы па баскетболе, гандболе і гэтак далей — для гульнявых відаў спорту дастаткова наяўнасці ў школы спартыўнай залы. Гэта будзе зручна перш за ўсё для дзяцей і іх бацькоў. Прыблізны расклад дня: ранішняя трэніроўка, снеданне, школьныя заняткі, абед, хатнія заданні пад прыглядам педагогаў, зноў трэніроўка, і вечарам, цалкам сябе рэалізаваўшы, дзіця адпраўляецца дадому. Пакуль што пасля заканчэння школы юныя спартсмены вымушаны выбіраць, што ім далей рабіць: або працягваць сур'ёзна займацца спортам, або ісці атрымліваць прафесію. А чаму б не рабіць гэта адначасова? Пасля заканчэння школы выпускнікі змогуць выбіраць тую навучальную ўстанову, дзе культывуецца іх від спорту. Зараз мы якраз вырашаем, якая з ВНУ будзе культываваць той ці іншы від спорту. Для прыкладу, ужо вырашана, што ў БНТУ гэта будуць плаванне і гандбол.

Прапанаваў Анатоль Тозік паклапаціцца і пра стварэнне для старшакласнікаў лагераў працы і адпачынку:

— Майце на ўвазе, што Савет Міністраў ужо прыняў дакумент, паводле якога ў аздараўленчых лагерах цяпер будуць адпачываць і аздараўляцца толькі дзеці ва ўзросце ад 6 да 15 гадоў. А для 16-17-гадовых школьнікаў павінны быць прадугледжаны іншыя формы баўлення летняга часу. Няхай адпачываюць у лагерах працы і адпачынку, як гэта было раней. Узроставыя абмежаванні не закрануць толькі спецыялізаваныя, профільныя, лагеры.

У сваім выступленні на калегіі міністр адукацыі Сяргей Маскевіч агучыў намер павысіць у 2013 годзе мінімальны тэставы бал для абітурыентаў, якія прэтэндуюць на атрыманне вышэйшай адукацыі. Так, па навучальных прадметах «руская мова», «беларуская мова», «матэматыка», «фізіка», «хімія» і «біялогія» плануецца ўстанавіць парог на ўзроўні 15 тэставых балаў, а па гісторыі, грамадазнаўстве, геаграфіі і замежнай мове — 20 тэставых балаў. Усе, хто атрымае на ЦТ меншыя балы, падаваць дакументы ў прыёмныя камісіі ВНУ не змогуць.

— Цалкам падтрымліваю павышэнне прахаднога бала, — падкрэсліў Анатоль Тозік. — Увогуле лічу, што міністэрствам адукацыі, эканомікі, працы і сацыяльнай абароны трэба вельмі сур'ёзна заняцца балансам працоўных рэсурсаў у краіне і структурай падрыхтоўкі кадраў. У нас тут відавочныя перакосы. Калі паглядзець па ўзроўнях адукацыі, атрымліваецца, што мы выпускаем аднаго радавога, аднаго сяржанта і двух лейтэнантаў для іх. Два апошнія гады на 10 тысяч насельніцтва ў нас прыпадала 460-470 студэнтаў, а ў Германіі — 297. Няўжо, калі чалавек атрымаў дыплом ВНУ, ён пойдзе потым працаваць мулярам? З аднаго боку, мы маем гіганцкі недахоп рабочых рэсурсаў, а з іншага — перавытворчасць уладальнікаў дыпломаў ВНУ. Прывяду толькі некалькі лічбаў: у 1990 годзе выпуск з агульнаадукацыйных школ склаў 78 тысяч чалавек. ВНУ прынялі ў той год на першы курс 37 тысяч студэнтаў, у тым ліку 25 тысяч — на дзённую бюджэтную форму навучання. Гэта значыць, што на «бюджэт» маглі паступіць 32% ад агульнай колькасці выпускнікоў. У 2012 годзе выпуск склаў 64 тысячы чалавек, а ў ВНУ на першы курс была залічана 81 тысяча чалавек. З іх на дзённую бюджэтную форму навучання — 25 тысяч (39% ад агульнай колькасці выпускнікоў). Усе астатнія паступілі навучацца за грошы. Так скажыце, якія пытанні да дзяржавы? За кошт бюджэтнай формы навучання мы задавальняем усе патрэбы дзяржавы ў падрыхтоўцы спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. А калі ты ўсё роўна хочаш атрымліваць вышэйшую адукацыю, то, калі ласка, плаці. Платная форма навучання павінна быць рэнтабельнай, а не стратнай для ВНУ. Школьнікі павінны ведаць, што калі яны будуць добра вучыцца, то змогуць паступіць на «бюджэт», атрымаюць стыпендыю і месца ў інтэрнаце. А калі малады чалавек па сваіх ведах «не дацягвае» да ўзроўню ВНУ, ёсць сярэднія спецыяльныя і прафесійна-тэхнічныя навучальныя ўстановы. Любая работа — ганаровая. І ў нас няма людзей першага і другога гатунку. Ёсць прафесіяналы ў сваёй справе. Гэта павінны зразумець і бацькі выпускнікоў, якія падштурхоўваюць сваіх дзяцей да паступлення менавіта ў вышэйшыя навучальныя ўстановы.

**Па навучальных прадметах «руская мова», «беларуская мова», «матэматыка», «фізіка», «хімія» і «біялогія» плануецца ўстанавіць парог на ўзроўні 15 тэставых балаў, а па гісторыі, грамадазнаўстве, геаграфіі і замежнай мове — 20 тэставых балаў.**

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

7 ЛЮТАГА 2013 г.
ЧАЦВЕР
№ 3 (15713)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года



*Раніца, маршрутка, брудны снег на ўзбочынах за акном.*
***Мой шлях ляжыць у Смалявічы, бо, як высвятляецца, каралевы прыгажосці жывуць і за мінскай кальцавой аўтадарогай.***
***Раней я ўжо чула пра казачную гісторыю Святланы Статкевіч, якую некаторыя з-за знешнасці параўноўваюць з Монікай Белучы, але мне хацелася ўбачыць гэту незвычайную маладую жанчыну не ў святле пражэктараў, а ў яе будзённым жыцці.***
***Зусім нядаўна, па выніках конкурсу «Mrs Multiverse International 2013», Святлана Статкевіч увайшла ў тройку найпрыгажэйшых жанчын планеты. А пачалося ўсё з нацыянальнага туру адборачнага конкурсу «Місіс Еўропа 2012».***
***Калі Святлана атрымала прапанову ўзяць у ім удзел, успрыняла яе як жарт, але пазней з'явілася думка: а чаму б і не?***

*Так здараецца!*

Святлана СТАТКЕВІЧ:

# «КАБ НЕШТА ЗМЯНІЦЬ У ЖЫЦЦІ — ТРЭБА НЕ БАЯЦЦА ПЕРАМЕН»

## *Дзякуючы нашай гераіні карэспандэнт газеты пераканалася, што Папялушка сапраўды можа ператварыцца ў Прынцэсу*

...Нашу з ёю размову перарывае тэлефонны званок, пасля якога яна пытаецца ў мяне: «Паедзем на дабрачынны вечар?» Мая падсвядомасць панікуе, бо раніцай я не дапускала і думкі, што дзень будзе мець такое завяршэнне. Але як ні дзіўна, пагаджаюся.

Паўгадзіны на зборы. Прыгожыя сукенкі, прычоскі... Глядзімся ў люстэрка, каб ацаніць свае намаганні. Побач са мной усё тая ж, але адначасова і іншая жанчына... Лёгкі макіяж, локаны спадаюць з плячэй. Святлана ў чорнай сукенцы, на абцасах і ў белым футры ператвараецца ў свецкую лэдзі. Гэта рэальнасць ці сон?..

❑❑❑

Але ўсё гэта будзе пазней, а спачатку... Дзверы мне адчыняе маладая жанчына ў маечцы і штанах. Валасы сабраныя ў хвосцік. Яна сёння адпачывае ад працы, таму вырашыла заняцца прыборкай. Я частуюся гарбатай і запяканкай на кухні Святланы, а потым мы пачынаем размову

— Калі я нарадзіла першае дзіця, мая вага была 95 кілаграмаў. Два гады мне спатрэбілася, каб «прыйсці» да 60-ці, — расказвае Святлана. — Пасля нарадзіўся сын, і я зноў набрала — 97 кілаграмаў. Паўтарыць уласны подзвіг мне каштавала неймаверных высілкаў. Давялося пераглядзець правілы харчавання, вельмі актыўна заняцца спортам. І ўсё ў комплексе прынесла чаканы вынік.

Я слухаю яе і разумею, што фітнэс і прабежкі па вечарах, безумоўна, твораць цуды, але ж якая павінна быць сіла волі? Святлана і да конкурсаў прыгажосці была паспяховай жанчынай. Яна мае свой вясельны салон, які, па яе словах, як трэцяе дзіця. Магчыма, адкрыць сваю справу падштурхнуў прыклад бацькі, які быў прадпрымальнікам, але пры гэтым актыўна займаўся дабрачыннай дзейнасцю.

Цікава, што да таго, як самой патрапіць пад пільныя позіркі членаў журы, Святлана ацэньвала іншых на конкурсах прыгажосці. Таму ўзняла б на смех любога, хто напрарочыў бы ёй уласны ўдзел у якасці канкурсанткі. Але летам зрабілі фотасесію, якая аказалася паспяховай. Пачалася падрыхтоўка: урокі дэфіле, бясконцая праца ў шалёным рытме... На нацыянальным адборачным туры «Місіс Еўропа» Святлана стала другой «Місіс Беларусь». Тэлефон разрываўся ад віншаванняў. А праз пяць дзён ёй паступіла прапанова прадставіць Беларусь на міжнародным конкурсе «Mrs Multiverse International 2013» у Дамініканскай Рэспубліцы. (На папярэднім такім конкурсе карону заваявала землячка — Ірына Ханунік-Рамбальская.)

**(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)**

*Ідэі маладых*

# САКРЭТЫ «ХРУМСТКАГА ЗОЛАТА»

## Беларускія навукоўцы навучыліся атрымліваць «залатыя лустачкі» — чыпсы — з... яблыкаў

**Пра тое, колькі садавіны «пацярпела» падчас спробаў атрымаць першы кілаграм адмысловага салодкага прадукту і чаму беларускія навукоўцы часам «вараца ва ўласным соку», — наша гутарка са старшым навуковым супрацоўнікам Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук па харчаванні, адным з распрацоўшчыкаў тэхналогіі і абсталявання для вытворчасці яблычных чыпсаў Сяргеем АРНАУТАМ, які сёлета за свой праект атрымаў стыпендыю Прэзідэнта Беларусі.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

### У пошуках ідэальнай лустачкі

— Ідэя з'явілася вельмі проста: у Беларусі шмат яблыкаў, груш, гарбузоў і іншай садавіны і гародніны, якая ў поўнай меры не выкарыстоўваецца. Калі я прыйшоў працаваць у навукова-практычны цэнтр, то займаўся тэхналогіяй і абсталяваннем для вытворчасці яблычных чыпсаў параўнальна з мой кіраўнік Зянон Валянцінавіч Лоўкіс, якога я заўжды згадваю з вялікай павагай, — кажа суразмоўца.

Перш чым стварыць гэты карысны і натуральны дэсерт, у якім, акрамя яблыкаў толькі цукар, лімонная кіслата і ванілін, давялося правесці безліч даследаванняў. Вызначыць ідэальную таўшчыню лустачкі, вывучыць гатункі яблыкаў, якія найбольш падыходзяць для вытворчасці, даведацца, што патрэбна рабіць, каб чыпсы былі хрумсткімі, колькі часу іх сушыць і пры якой вільготнасці. Карацей, пытанняў было шмат. Спачатку ў Мар'інай Горцы мы зрабілі невялікую лінію па вытворчасці яблычных чыпсаў: рэзальная машыны, інсталятар, канвеер, сушыльная шафа. Яблычныя чыпсы, дарэчы, не смажацца ў алеі, як бульбяныя, а сушацца. Пасля тэхналогію купіла СВК «Астрамечава», а таксама нядаўна зацікавіўся ёй і Слонімскі вінзавод. Вырашэнне пытання па наладжванні вытворчасці на гэтым прадпрыемстве пакуль упіраецца ў фінансаванне.

**(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)**

*Будзь у тэме!*

# У ВЫБАРЫ ПРАФЕСІІ «ДРОБЯЗЯЎ» НЯМА

## *...і за кампанію навучальную ўстанову НЕ ВЫБІРАЮЦЬ*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Калі надышоў час вызначацца з будучай прафесіяй, пятнаццацігадовая Вераніка нечакана для ўсіх заявіла, што хоча стаць... ветэрынарам. Бацькі былі моцна здзіўлены такім выбарам сваёй дачкі, але мудра вырашылі не ціснуць на дзяўчыну, а шукаць аргументы, каб пераканаць яе ў памылковасці выбару. Нават знайшлі чалавека, які ведае пра работу ветэрынара не па чутках, а мае ўласны досвед. І калі заўзятая гараджанка зразумела, што лячыць ёй давядзецца зусім не коцікаў ці сабачак (бо існуе вялікая верагоднасць таго, што працаваць давядзецца ў сельскай мясцовасці), а пра свой вытанчаны манікюр увогуле можна забыцца назаўсёды, прафесія ветэрынара адразу страціла для яе сваю прывабнасць.**

**Шчыра кажучы, пры той шматлікасці прафесій, якія прапануюць сёння навучальныя ўстановы, вельмі праблематычна не разгубіцца нават даросламу чалавеку. А што ўжо казаць пра падлеткаў? І ўсё ж такі, як не памыліцца з выбарам прафесіі? Як у поўнай ступені рэалізаваць свой патэнцыял? Якія прафесіі для рынку працы найбольш перспектыўныя? Пра ўсё гэта мы гутарым з начальнікам аддзела арганізацыйна-метадычнага забеспячэння прафарыентацыйнай работы Рэспубліканскага цэнтра прафарыентацыі моладзі Кацярынай ПАСТУШКОВАЙ.**

***(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)***

ЧЫРВОНКА. Чырвоная змена
7 02 2013 г.

# У ВЫБАРЫ ПРАФЕСІІ «ДРОБЯЗЯЎ» НЯМА



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

— Многія старшакласнікі ўпэўненыя, што галоўнае — атрымаць дыплом, а што ў ім напісана — прынцыповага значэння не мае. На жаль, але для большасці выпускнікоў характэрная арыентацыя менавіта на атрыманне вышэйшай адукацыі, чаму, між іншым, спрыяе і яе даступнасць. Але паступіць у вышэйшую навучальную ўстанову — гэта толькі палова справы. Там трэба вучыцца, здаваць экзаменацыйныя сесіі, а пасля заканчэння навучання — працаўладкоўвацца. Калі студэнт навучаўся на бюджэтнай форме, дзяржава прадаставіць яму першае працоўнае месца. А калі ён быў «платнікам», ды яшчэ і засвойваў эканамічную спецыяльнасць? Сёння рынак працы ў краіне арыентаваны пераважна на рабочыя прафесіі. Арганізацыям і прадпрыемствам патрабуюцца кіроўцы аўтамабіляў, муляры, швачкі, цесляры, электрагазазваршчыкі, маляры, трактарысты, а таксама ўрачы і медыцынскія сёстры.

Безумоўна, нельга сказаць адназначна, што юрысты, бухгалтары ці эканамісты ўвогуле не патрабуюцца. Але наймальнікі шукаюць галоўным чынам прафесіяналаў з багатым досведам работы, таму ўчарашніх выпускнікоў у якасці прэтэндэнтаў, як правіла, не разглядаюць.

## Прыслухайся да сябе

**— Якія асноўныя памылкі дапускаюць школьнікі пры выбары прафесіі?**

— Класічная памылка — выбар прафесіі «за кампанію». Добра, калі выбраная прафесія будзе адпавядаць інтарэсам і здольнасцям маладога чалавека, а калі не, то абавязкова з'явіцца расчараванне, жаданне распачаць усё, так бы мовіць, з белага ліста. І страчаны час будзе дробяззю ў параўнанні з тым, што чалавек можа ўсё сваё жыццё займацца нелюбімай справай. Адчуванне ўласнай нерэалізаванасці яму гарантавана...

**Пры выбары прафесіі трэба ўлічваць СВАЕ інтарэсы, схільнасці, а не кіравацца захапленнямі сяброў. Неабходна прыслухацца і разабрацца, што цікава непасрэдна табе.**

Часцей за ўсё выбар прафесіі «за кампанію» тлумачыцца няўпэўненасцю школьнікаў у сабе і іх негатоўнасцю ўзяць на сябе адказнасць за ўласны выбар. Але пры выбары прафесіі трэба ўлічваць СВАЕ інтарэсы, схільнасці, а не кіравацца захапленнямі сяброў. Неабходна прыслухацца да сябе і разабрацца, што цікава непасрэдна вам, убачыць адрозненні паміж сабой і сябрамі.

Даволі тыповая сітуацыя, калі прафесія падабаецца чалавеку таму, што сімпатыю выклікае прадстаўнік гэтай прафесіі. Напрыклад, выпускнік вырашае звязаць сваё жыццё з хіміяй, таму што захапляецца сваім настаўнікам хіміі як чалавекам і педагогам. Калі такі інтарэс да асобы ўспрымаецца як схільнасць да прафесіі — існуе вялікая рызыка памылкі. Ці, напрыклад, старшакласніку можа спадабацца пэўны вучэбны прадмет, скажам, замежная мова. Існуе шмат прафесій, якія патрабуюць ведання замежнай мовы. І яшчэ невядома, ці спадабаецца вам работа выкладчыка замежнай мовы. А можа з вас атрымаецца добры перакладчык? Ставіць знак роўнасці паміж прафесіяй і вучэбным прадметам нельга. Школьны прадмет — гэта не прафесія, а галіна ведаў, у якой можна працягнуць адукацыю. Абавязкова трэба ўлічваць, якія рэальныя прафесіі стаяць за канкрэтнымі школьнымі прадметамі.

Дарэчы, вялікая колькасць школьнікаў хоча быць кіраўнікамі. «Хачу быць дырэктарам» — заяўляюць яны. Але дырэктар — гэта не прафесія, а пасада. Мы ім звычайна кажам: для таго, каб сесці ў дарагое скуранае крэсла топ-менеджара, давядзецца пасядзець на звычайным драўляным крэсле, прайсці праз усе прыступкі кар'ернай лесвіцы, працаваць простым спецыялістам, набірацца досведу, павышаць сваю кваліфікацыю... Увогуле для сучаснай моладзі характэрна завышаная самаацэнка, калі ўзровень іх прэтэнзій не адпавядае таму, кім насамрэч з'яўляецца малады чалавек.

## Знешні бляск — не крытэрый

**— А якая роля ў прафесійным выбары дзяцей належыць іх бацькам? Ці не навязваюць яны ім сваё бачанне будучыні?**

— Падчас прафкансультацый я даволі часта сутыкаюся з сітуацыяй, калі бацькі прыводзяць да нас дзяцей з адной мэтай — аказаць на дзіця ціск з дапамогай кансультанта. Рызыкну выказаць думку, што нярэдка менавіта нерэалізаванасць бацькоў у прафесійным плане прыводзіць да таго, што яны навязваюць дзецям свой выбар. Прычым менавіта для іх на першы план выходзіць прэстыжнасць той ці іншай прафесіі. І, не давядзі Бог, калі дзіця схіляецца да непрэстыжнай і малааплатнай, на іх думку, прафесіі. А прэстыжнасць/непрэстыжнасць — крытэрый надзвычай хісткі і непрыдатны для таго, каб арыентавацца на яго пры прыняцці рашэнняў, што вызначаюць далейшы лёс дзіцяці. Можна стаць уладальнікам «моднай» прафесіі ці спецыяльнасці, якая не будзе прыносіць маральнага задавальнення. Да таго ж не выключана, што на момант заканчэння навучальнай установы «моднымі» стануць зусім іншыя прафесіі. Да і на патрэбы рэгіянальнага рынку працы таксама трэба арыентавацца.

А здараецца і так, што бацькі, у якіх дзякуючы атрыманай прафесіі жыццё склалася ўдала, хочуць, каб іх дзеці шлі па іх слядах, працягвалі прафесійную дынастыю. Але ў любым выпадку ў першую чаргу павінны ўлічвацца здольнасці, інтарэсы і схільнасці канкрэтнага дзіцяці. І мы заўсёды кажам бацькам, якія прыходзяць разам з дзецьмі да нас на кансультацыю, што будзем рэкамендаваць тую галіну прафесійнай дзейнасці, якая падыходзіць менавіта дзіцяці, а не яго сваякам. У бацькі могуць і павінны дапамагчы, дык гэта ў прадастаўленні дзіцяці як мага большага аб'ёму інфармацыі для здзяйснення ім правільнага, асэнсаванага самастойнага выбару.

Хачу папярэдзіць яшчэ адну распаўсюджаную памылку пры выбары прафесіі — захапленне толькі знешнім бокам прафесіі, без уліку яе зместу і магчымых працоўных выдаткаў. Узяць хоць бы прафесію журналіста. Маладыя людзі, як правіла, мараць трапіць на тэлебачанне. Але журналіст не заўсёды выступае ў тэлеперадачах — часцей за ўсё ён аналізуе вялікі аб'ём інфармацыі, кантактуе з многімі людзьмі, першы чым падрыхтуе паведамленне ці тэлесюжэт працягласцю ў некалькі хвілін, якія агучыць, хутчэй за ўсё, не ён сам. Гэта можа быць і дыктар тэлебачання. Але дыктар і журналіст — не адно і тое ж. Увогуле, кантактуючы з моладдзю, я заўважыла, што школьнікі надзвычай захапляюцца тэлевізійнымі перадачамі кшталту «Кватэрнага пытання» — усе масава мараць стаць дызайнерамі. Аднак для таго, каб паступіць на спецыяльнасць «дызайнер», трэба мець як мінімум мастацкія здольнасці і адпаведную падрыхтоўку. Інакш комплексны творчы экзамен здаць немагчыма. Але чамусьці такая «дробязь» пад увагу патэнцыяльнымі абітурыентамі не бярэцца...

**Для сучаснай моладзі характэрна завышаная самаацэнка, калі ўзровень прэтэнзій не адпавядае таму, кім насамрэч з'яўляецца малады чалавек.**

Вырашальным аргументам на карысць выбару той ці іншай прафесіі для некаторых падлеткаў можа стаць нават наяўнасць форменнага адзення. Хапае дзяўчынак, якія мараць стаць сцюардэсамі, і юнакоў, якія мараць аб ваеннай кар'еры ці рабоце ў падраздзяленнях МНС толькі таму, што іх прываблівае прыгожая форма. Гэта памылковы шлях. Выбіраючы прафесію, важна дакладна ўяўляць сабе, якія віды дзейнасці ўключае ваша будучая спецыяльнасць, якія вас чакаюць цяжкасці, якія ў будучай рабоце ёсць асаблівасці, нябачныя староннаму позірку.

## Сангвінікі не цярпяць аднастайнасці

**— Кацярына Мікалаеўна, а ці трэба ўлічваць пры выбары прафесіі тэмперамент чалавека?**

— Абавязкова. Паколькі халерыку будзе цяжка стаць, напрыклад, псіхолагам. Сангвінік можа быць надзейным у любой рабоце, акрамя аўтаматычнай, аднастайнай і маруднай, ён больш здольны да рухавай дзейнасці, якая патрабуе кемлівасці, знаходлівасці, актыўнасці і гэтак далей. Да таго ж існуюць і прафесійна важныя асобасныя якасці, без якіх стаць добрым спецыялістам будзе праблематычна. Напрыклад, педагог — прафесія публічная, педагогу заўсёды давядзецца быць у цэнтры ўвагі, таму без эмацыянальнай устойлівасці і ўмення кантактаваць з людзьмі яму ніяк не абысціся. Кіроўцу абавязкова патрабуецца высокая хуткасць рэакцыі. Работа бухгалтара патрабуе максімальнай пунктуальнасці, устойлівасці да аднастайнай і манатоннай дзейнасці.

Увогуле, школьная паспяховасць зусім не абавязкова з'яўляецца гарантыяй паспяховай сацыялізацыі і самарэалізацыі выпускніка. Вядома, добрая падрыхтоўка істотна пашырае дыяпазон прафесій, з якіх школьныя выдатнікі могуць выбіраць. Але не меншае значэнне маюць і асобасныя якасці маладога чалавека.

**— А на якую дапамогу можа разлічваць малады чалавек, які вырашыць звярнуцца ў Рэспубліканскі цэнтр прафарыентацыі моладзі?**

— Школьнікам і абітурыентам мы прапаноўваем два віды індывідуальных кансультацый. Звычайная прафкансультацыя ўключае папярэднюю гутарку з прафкансультантам, запаўненне анкеты, камп'ютарную дыягностыку і завяршальную гутарку з рэкамендацыямі. Камп'ютарнае тэсціраванне — гэта комплекс тэстаў, якія дазваляюць выявіць найбольш выяўленыя прафесійныя інтарэсы, матывы і схільнасці, вядучы прафесійны тып, вызначыць прафесійна-асобасныя характарыстыкі ўдзельніка кансультацыі. Звычайна тэсціраванне ўключае ад 60 да 200 пытанняў, у сярэднім — каля 100. Універсальнага набору тэстаў і методык, прыдатных для ўсіх, не існуе. Пытанні бываюць розныя: гэта і заданні, і просьбы выбраць найбольш прывабную для сябе альтэрнатыву, прыгадаць, як вы паводзіце сябе ў тых ці іншых сітуацыях. Абмежаванняў па часе на праходжанне тэста не існуе. Выключэнне складаюць толькі тэсты на інтэлект, дзе для адказу на ўсе пытанні адводзіцца пэўны адрэзак часу. Ёсць у нас таксама і тэст на тэхнічнае мысленне, які вельмі складана прайсці. Тым не менш знаходзяцца і дзяўчынкі, якія яго праходзяць, хоць усё ж такі дзяўчынкі часцей маюць схільнасці да гуманітарных навук. Завяршаецца кансультацыя гутаркай з псіхолагам-прафкансультантам.

**Школьная паспяховасць зусім не абавязкова з'яўляецца гарантыяй паспяховай сацыялізацыі і самарэалізацыі выпускніка.**

Другі від кансультацыі — прафкансультацыя з улікам стану здароўя падлетка з прыцягненнем псіхолага і фізіёлага. Асноўны прынцып такой кансультацыі — рэкамендацыя такога віду працоўнай дзейнасці, які б не аказаў адмоўны ўплыў і не пагоршыў здароўе. Гэта вельмі карысная кансультацыя для падлеткаў, якія ўжо маюць хранічныя захворванні...

## Прэч сумненні!..

**— А ці могуць дапамагчы ў цэнтры студэнтам ці маладым спецыялістам, якія засумняваліся ў правільнасці свайго прафесійнага выбару?**

— У нас практыкуюцца кансультацыі для дарослых з мэтай карэкціроўкі іх прафесійнага плана. Часцей за ўсё ў цэнтр прыходзяць студэнты першага-другога курса навучання — гэта менавіта той час, калі маладыя людзі ацэньваюць правільнасць свайго прафесійнага выбару і выбару навучальнай установы. У іх ёсць сумненні, і яны імкнуцца іх развеяць ці, наадварот, пераканацца, што трэба змяняць свой прафесійны вектар. У прынцыпе, наш кантынгент — гэта маладыя людзі ва ўзросце да 31 года. Калі чалавек шукае прычыны дыскамфорту ў прафесіі — калі ласка, запрашаем у цэнтр прафарыентацыі на кансультацыю. Галоўнае — своечасова зразумець здзейсненую прафесійную памылку. Можна прыгадаць шмат прыкладаў, калі ўрачы станавіліся вядомымі спевакамі, інжынеры — пісьменнікамі, педагогі і медыкі — журналістамі і дыпламатамі. Стаць шчаслівым у прафесійнай сферы ніколі не позна!

**Гутарку вяла Надзея НІКАЛАЕВА.**

***Запіс на прафкансультацыю і даведкі па тэлефоне (017) 293 79 48***

## Плануючы сваю прафесійную кар'еру, карысна адказаць на наступныя пытанні:

*Ад якіх сваіх навыкаў і здольнасцяў вы атрымліваеце найбольшае задавальненне?*
*Якія вашы асноўныя інтарэсы і ўлюбёнае баўленне часу?*
*Чым бы вы хацелі займацца кожны дзень па 8 гадзін з года ў год?*
*Пра якую працу вы марыце?*
*Якім вы ўяўляеце свой занятак праз 10 гадоў?*
*Якая работа была б для вас ідэальнай? Уявіце сябе на гэтай рабоце: з кім вы працуеце, як праводзіце час...*
*Якія вашы крытэрыі пры выбары прафесіі (абавязковыя і пажаданыя)?*
*Якія вашы моцныя бакі і навыкі дазваляюць вам лічыць, што вы падыходзіце для працы, якая бачыцца вам ідэальнай?*
*Якія прабелы ў сваіх уменнях і навыках вам трэба ліквідаваць, каб атрымаць ідэальную для вас працу?*
*Калі ідэальная для вас праца пакуль недасягальная, то якую працу вы маглі б выконваць, каб рухацца ў выбраным напрамку?*
*З кім можна параіцца, каб атрымаць карысную для планавання кар'еры інфармацыю?*

*Важная справа*

# СТВАЛАВЫЯ КЛЕТКІ...
# СА ЗВЫЧАЙНЫХ ВАЛАСОЎ


Фота Надзеі БУЖАН.

**«Прэзідэнцкай стыпендыі я была ўшанавана за вывучэнне ствалавых клетак. Дакладней, за новыя метады іх атрымання. Ствалавыя клеткі маюць такую ўласцівасць — пераўтварацца амаль у любую тканку чалавечага арганізма, а таму шырока выкарыстоўваюцца ў медыцыне, напрыклад, пасля хіміятэрапіі», — уводзіць у курс справы наша сённяшняя суразмоўца, супрацоўніца Інстытута генетыкі і цыталогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Ніна БАЛАШЭНКА.**

— Навукай я вырашыла займацца даўно, яшчэ ў школе, — прыгадвае яна, — прычым цікавіла мяне менавіта генетыка. У выніку апынулася на біяфаку БДУ. Мой факультэт дапамог вызначыцца з выбарам канчаткова: я спынілася на навуковай дзейнасці. У гэтым інстытуце з'явілася, калі была студэнткай трэцяга курса. Калі скончыла ўніверсітэт, прыйшла сюды па размеркаванні. Мне тут цікава, плюсоў у працы значна больш. Увогуле, многіх маіх калег падштурхоўвае працаваць не жаданне зарабіць грошы, а звычайная цікаўнасць: «Што з гэтага атрымаецца?»

Як лічыць Ніна Балашэнка, грошы наўрад ці могуць тут кагосьці ўтрымаць. Хаця стыпендыя па падтрымцы таленавітай моладзі вышэйшая за яе месячны заробак. Яна стымулюе і адначасова падштурхоўвае працаваць. Ніна, між іншым, далёка не адзіная прэзідэнцкая стыпендыятка ў інстытуце: у адным пакоі з ёю працуе Насця Сапун, дзяўчына, з якой яны нарадзіліся ў адзін год і адзін дзень, вучыліся разам у Ліцэі БДУ, затым на адным факультэце, а пазнаёміліся бліжэй толькі тут. Яна таксама атрымлівае стыпендыю па падтрымцы аспірантаў за вывучэнне працэсу ракавай трансфармацыі клетак.

— Мець інстытут генетыкі ў краіне вельмі важна. Тут распрацоўваюцца і выконваюцца генетычныя тэсты. Напрыклад, тэст на такое захворванне, як гемахраматоз, робяць толькі ў нашым інстытуце. Таксама робяцца тэсты ДНК, каб выявіць у маладых спартсменаў іх здольнасці да пэўных спартыўных дасягненняў, — распавядае Ніна Балашэнка. — Мы шукаем новыя шляхі атрымання ствалавых клетак з чалавечых валасоў. Дакладней, з валасяных фалікулаў. Справа ў тым, што ствалавыя клеткі ёсць не толькі ў эмбрыёнаў, але і ў дарослых людзей. Праўда, у нашым арганізме яны прысутнічаюць у вельмі абмежаванай колькасці. Наша задача — не даць ім загінуць і, галоўнае, размножыць іх.

Не буду прэтэндаваць на сусветнае першынство ў гэтым пытанні, але калі пачынала працаваць, ніякіх публікацый замежных навукоўцаў на гэтую тэму яшчэ не было. Яны з'явіліся толькі зараз, і тое не шмат. Спадзяюся, што хутка нашы дасягненні можна будзе прымяняць на практыцы.

Яшчэ ў інстытуце актыўна вывучаюць уласцівасці целамеразы. Справа ў тым, што кожная здаровая клетка нашага арганізма можа дзяліцца толькі пэўную колькасць разоў. Фермент пад назвай целамераза фактычна можа зрабіць клетку бессмяротнай. Адзіны мінус: высокая канцэнтрацыя целамеразы — уласцівасць ракавых клетак. Менавіта таму ракавыя клеткі могуць дзяліцца бясконца. Вось гэты самы фермент, які робіць клеткі бессмяротнымі і адначасова павялічвае рызыку раку, і плануецца вывучаць.

— Дарэчы, генетыка — далёка не адзінае, чым я жыву. У вольны час я люблю маляваць, бо вучылася ў гімназіі-каледжы мастацтваў імя Ахрэмчыка. А яшчэ раблю ўпрыгажэнні і лялек з тканіны і пластыку, — дадае суразмоўца.

Такой аказалася Ніна Балашэнка — малады беларускі навуковец-генетык са шчырай і прыгожай усмешкай, незвычайным хобі і вельмі важнай здольнасцю — не проста тэарэтычна разважаць пра навуку, але і займацца ёю ўсур'ёз.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**

# САКРЭТЫ «ХРУМСТКАГА ЗОЛАТА»

### Паўтоны «пацярпелых» яблыкаў

— Яблыкаў падчас выпрабаванняў «пацярпела» шмат. За некалькі тыдняў, пакуль былі ў Мар'інай Горцы, пяцьсот кілаграмаў садавіны змарнавалі дакладна. Неабходна і рэзальную машыну выпрабаваць, і сушыльную шафу, ды і на лабараторныя даследаванні яблыкі ахвяраваць. Прадукцыю, вядома, дэгуставалі, але не настолькі, каб яблыкі ўзненавідзець, — смяецца навуковец.

**Яблыкаў падчас выпрабаванняў «пацярпела» шмат. За некалькі тыдняў, пакуль былі ў Мар'інай Горцы, пяцьсот кілаграмаў садавіны змарнавалі дакладна.**

Для чыпсаў падыходзяць толькі плады першага ці вышэйшага гатункаў, сабраныя з дрэва ўручную — без пабітых бакоў і плямаў. З пяці кілаграмаў садавіны пасля сушкі атрымліваецца кілаграм чыпсаў. «Летась бачыў яблычныя чыпсы, зробленыя па нашай тэхналогіі, як ні дзіўна, у аптэцы. Таксама нейкі былі яны і ў адным са сталічных гіпермаркетаў. Але спецыяльна іх не шукаў. Раней чыпсы зваліся «Залатыя лустачкі». Пасля таго, як прадпрыемства, што іх выпускае, паспрабавала выйсці на расійскі рынак, назву змянілі на «Фрустяшкі». Пад якім брэндам цяпер выпускаюцца, нават і не ведаю».

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)



### Патэнты ≠ Грошы

Пасля таго, як прадпрыемства купляе нейкую тэхналогію для сваёй вытворчасці, навукоўцам яна ніякіх «аўтарскіх» дывідэндаў не прыносіць, колькі б гадоў у далейшым ёй ні карысталіся. Нягледзячы на тое, што ў нас, як у распрацоўшчыкаў, маюцца патэнты і на рэзальную машыну, і на саму тэхналогію вытворчасці, праверыць, які даход атрымала прадпрыемства на тых жа яблычных чыпсах, мы не маем права. Прадпрыемства можа не валодаць аўтарскімі правамі на распрацоўку, але яно будзе валодаць тэхналогіяй, за якую заплаціла грошы. У гэтай сітуацыі мы альбо згаджаемся прадаць тэхналогію і атрымліваем хоць нейкі даход, альбо ўвогуле застаёмся ні з чым, бо, як правіла, прадпрыемства можа знайсці іншы спосаб наладзіць вытворчасць. Максімум, на што распрацоўшчыкі могуць разлічваць, — размяшчэнне інфармацыі пра іх на ўпакоўцы. А між іншым кожны год Навукова-практычным цэнтры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні выдаецца каля пятнаццаці патэнтаў на розныя вынаходкі і распрацоўкі. Як на тэхналогіі, так і на абсталяванне.

**Мы не заўжды сядзім на месцы, — ездзім на розныя семінары і выставы. Але ўсё ж «варымся ва ўласным соку», паколькі паездкі і навуковыя кантакты адбываюцца пераважна ў межах Беларусі ці Расіі.**

### Замежжа і «ўласны сок»

— Для стажыроўкі выбраў бы паездку ў любую развітую краіну. Галоўнае, каб можна было вывучаць вопыт на вытворчасці. Даводзілася чуць ад замежных спецыялістаў, што вялікія фірмы, якія працуюць над стварэннем абсталявання для вытворчасці, маюць напрацоўкі, якія нашым навукоўцам і не сніліся. Хацелася б паглядзець, ці сапраўды гэта так, атрымаць нейкія навыкі. Так, мы не заўжды сядзім на месцы, ездзім на розныя семінары і выставы. Але ўсё ж «варымся ва ўласным соку», паколькі паездкі і навуковыя кантакты адбываюцца пераважна ў межах Беларусі ці Расіі. Але, як правіла, стажыроўка — гэта не тыдзень, а як мінімум тры месяцы. Ніводны начальнік свайго падначаленага на такі тэрмін не адпусціць. Пра існаванне нейкіх грантаў мы часам нават і не ведаем. Верагодна, Рада маладых вучоных якраз і здолела б дапамагчы ў інфармаванні пра такія магчымасці, — гаворыць Сяргей Арнаут.

А калі ўзгадваць аб праблемах, дык часам хацелася б лепшай матэрыяльнай падтрымкі, бо не заўсёды ёсць грошы на набыццё якасных апаратаў, дадае суразмоўца. «Напрыклад, неабходныя мне датчыкі тэмпературы — толькі замежнай вытворчасці, і каштуюць шмат мільёнаў рублёў. І каб купіць іх, трэба патраціць не толькі грошы, а яшчэ і шмат сіл і нерваў».

Дарэчы, з'ехаць працаваць за мяжу ў нашага героя магчымасць была. «Так атрымалася, што застаўся тут. Паслухаўся парады бацькоў, што трэба скончыць універсітэт, а раз ужо паступіў у аспірантуру, яе таксама кідаць не варта».

### Пакаленні, ідэі і бібліятэкі

На думку Сяргея Арнаута, зараз нейкую незанятую нішу ў нашай навуковай сферы шукаць усё цяжэй і цяжэй. У часы, калі абараняліся старэйшыя калегі, тэматыка для даследаванняў была больш шырокай.

— Яшчэ адно адрозненне — цяперашнія аспіранты могуць не праводзіць столькі часу ў бібліятэках, бо шмат якую патрэбную інфармацыю можна знайсці ў электронным выглядзе. А з дапамогай спецыяльных камп'ютарных праграм можна паскорыць працу над чарцяжамі ці разлікамі. У сувязі з гэтым і патрабаванні сталі іншымі, таму атрымаць ступень кандыдата тэхнічных навук, на мой погляд, сёння больш складана, чым пару дзесяцігоддзяў таму.

Калі казаць пра тое, ці рэальна маладому беларускаму навукоўцу сёння ажыццявіць уласны праект, то на рэалізацыю сапраўды цікавай ідэі, у прынцыпе, можна атрымаць не толькі дзяржаўную падтрымку, але і выйграць замежны грант. У маладых ідэі ёсць, толькі вось на пачатковым этапе кар'еры вельмі шмат залежыць ад кіраўніка, ад таго напрамку, у якім ён параіць працаваць.

### Выхадныя «з'ядала» дысертацыя

— А як жа сям'я, пытаецеся? — Паўнацэнна ўдзяляць увагу ёй атрымалася толькі пасля таго, як скончыў дысертацыю. У кіраўніцтва заўжды было меркаванне, што аспірант павінен спаць мала. Трэба, каб на працы ён з'яўляўся раней за ўсіх, пабалей праводзіў розных доследаў, а дадому сыходзіў як мага пазней. Усё для таго, каб за тры гады паспець напісаць дысертацыю. Трэба сказаць, што ў мяне ўклаўся ў тэрмін не атрымалася. Пакуль быў заняты дысертацыяй — а гэтаму прысвяціў амаль пяць гадоў — выхадных лічы што не было. У выхадны дзень таксама прыходзіў на працу. Жонка ўсе пяць гадоў пакутавала. Працу па доме можна было б неяк падзяліць на дваіх, але гэта не атрымалася. Таму на час маіх татальных заняткаў жонцы давялося шмат чаго ўзваліць на свае плечы. І да бацькоў мы рэдка ездзілі, і амаль нідзе не бывалі разам. Жонка, дарэчы, з навуковай дзейнасцю не звязана.

**На час маіх татальных заняткаў жонцы давялося шмат чаго ўзваліць на свае плечы. І да бацькоў мы рэдка ездзілі, і амаль нідзе не бывалі разам.**

### Рыбалка, кухня і футбол

— Яшчэ калі жыў у Слоніме і вучыўся ў школе, захапляўся футболам. Пасля стаў перад выбарам: альбо сур'ёзна вучыцца, альбо — сур'ёзна займацца спортам, — пераходзім мы ўжо да іншых тэм. — Дзякуючы таму, што аддаў перавагу вучобе, змог паступіць на бюджэтнае месца ва ўніверсітэце, якіх, дарэчы, было толькі тры. Але пра футбол не забыўся, зараз абавязкова карыстаюся магчымасцю пабегаць за мячом па полі, нияк удзельнічаў у турнірах, выступаючы за каманду Акадэміі навук. Як заўзятар, раней сачыў за гульнёй «Дынама-Кіеў», пакуль там быў Андрэй Шаўчэнка. Зараз жа праглядаю ўсе замежныя чэмпіянаты, дзе гуляюць беларускія, расійскія і украінскія легіянеры. Нейкі адзін любімы футбольны клуб назваць цяжка.

Яшчэ люблю павудзіць рыбу. На гэтае захапленне, на жаль, часу застаецца яшчэ менш, чым на футбол. Ды і як на мой густ, у Мінску рыбалка — зусім не тое, што дома, ля Слоніма.

Нягледзячы на тое, што працую над тэхналогіямі ў харчаванні, цудоўна адчуваю сябе і на звычайнай кухні. У часы студэнцтва жыў у інтэрнаце, мама з татам мне абеды не гатавалі. А калі яшчэ затрымаешся на парах дапазна, то і ў сталовую не трапіш. Харчавацца ж я прывык як належыць, а не «пячэнькамі» і гарбатай. Даводзілася кулінарыць самастойна. Затое цяпер, калі трэба нешта прыгатаваць — няма праблем. Салодкае, першыя стравы, ды што заўгодна. Кажуць, атрымліваецца смачна.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
07 02 2013 г.

# «КАБ НЕШТА ЗМЯНІЦЬ У ЖЫЦЦІ — ТРЭБА НЕ БАЯЦЦА ПЕРАМЕН»


Фота з архіва Святланы СТАТКЕВІЧ.

**(Заканчэнне.**
**Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

...Дванаццаць дзён, праведзеных у Дамініканскай Рэспубліцы, складаліся з бясконцых фотасесій, паказаў, паездак у дзіцячыя дамы, прыёмаў у першых асоб.

— Складаны трапічны клімат і ўсяго 2-5 гадзін на сон... — мая суразмоўца не знаходзіць слоў. — Конкурс здымалі ў фармаце рэаліці-шоу. Паказ яго, безумоўна, стане прыемным бонусам для прыхільнікаў. Шчыра кажучы, і самой хацелася б паглядзець.

❑❑❑

— Каб усюды паспець, важна ўмець правільна расстаўляць прыярытэты. Справы, якія патрабуюць неадкладнага ўдзелу, я стаўлю на першы план, — дзеліцца сваімі сакрэтамі Святлана.

Муж ніколі не перашкаджаў у яе імкненні рухацца наперад. Калі пачаліся конкурсы і перамогі, ён толькі выказваў захапленне каханай жанчынай. А пазнаёміліся Святлана з Алегам на старым Новым год. Яна чакала сяброўку ў кавярні. Алег таксама аказаўся там са сваім сябрам, які, як высветлілася, ведаў Святлану. Надвор'е было цёплым, і маладыя людзі запрасілі дзяўчыну прагуляцца... З той сустрэчы пара так і ідзе разам па жыцці. Сёння яны гадуюць дваіх дзяцей: трохгадовага сына Івана і шасціґадовую Яўгенію.

Калі Святлана даведалася, што стане маці, то запрасіла мужа ў іх улюбёную кавярню і там, пакуль чакалі заказ, падарыла яму... пустышку. Ён адразу пра ўсё здагадаўся і ўзрадаваўся навіне.

— Часам дачка кажа мне: «Ты сварышся на мяне — значыць, не любіш?» — расказвае Святлана. — На што я ёй адказваю: «Дачушка, я раблю гэта, бо вельмі моцна цябе люблю і імкнуся накіроўваць цябе па жыцці, пакуль ты яшчэ не можаш рабіць гэта самастойна».

У выхаванні дзяцей Святлана — прыхільнік дэмакратыі, любіць парадаваць малых ласункамі і салодкім. Цацкі можна сустрэць па ўсім доме.

— Сыну за апошнія тры месяцы купілі ўжо чацвёртую дзіцячую чыгунку. Напэўна, у нашай сям'і расце будучы міністр транспарту, — усміхаецца Святлана.

Сама яна ў дзяцінстве была добрай і паслухмянай дзяўчынкай. Быў толькі адзін «пракол»: калі кінула музычную школу і доўга ўтойвала свой «пабег» ад бацькоў. Проста гэты занятак стаў ёй нецікавым.

❑❑❑

— Кожны дзень чалавек павінен рабіць нешта добрае для душы і цела і хаця б раз на тыдзень — адну добрую справу для іншых людзей, — такога правіла прытрымліваецца беларуская прыгажуня. А інакш для чаго жыць?

— Раней я імкнулася нешта даказваць іншым. Гэта было для мяне стымулам ісці наперад. Зараз усё па-іншаму: проста раблю тое, што мне падабаецца. І дакладна ведаю, што ўсё атрымаецца. Здаецца, я дасягнула гармоніі.

Цікаўлюся, няўжо ніколі не хацелася спыніцца, адпачыць і не ісці далей?

— Такі момант быў зусім нядаўна, перад конкурсам у Дамінікане. Я настолькі стамілася ад шчыльнага графіка, ад праблем, што проста села і заплакала. Здалося, што больш проста не вытрымаю. А потым падумала: ну вось я зараз здамся, і што? Не скарыстацца такім шансам — гэта глупства! «Намалявала» ўсмешку на твары і прадоўжыла свой шлях.

Цікаўлюся, як адпачывае Святлана?

— Калі ў мяне ёсць магчымасць, абавязкова пасплю. А пасля буду ўсё рабіць: гатаваць, займацца з дзецьмі. Нядаўна дачцэ казку перад сном чытала, дзе кароль задае багатаму і беднаму пытанне: што самае салодкае ў жыцці? Адказ просты — сон. Бо калі чалавек хоча спаць, то яму ніякія скарбы ў свеце не патрэбны.

Пагаджаюся, што сон карысны, але настойліва распытваю пра тое, што ж патрэбна жанчыне, каб быць прыгожай і прывабнай.

— Адна мая знаёмая неяк сказала: жанчына — гэта лэдзі, а лэдзі павінна быць у сукенцы. Гэтыя словы заставілі мяне задумацца і змяніць свае погляды на ўласны гардэроб.

Калі раней у яе шафе былі джынсы і футболкі, то цяпер гэта ў асноўным сукенкі... Увогуле, акрамя адзення, на думку Святланы, абавязковыя атрыбуты прыгажосці — акуратнасць і дагледжанасць.

❑❑❑

...Вы не паверыце, але званок з запрашэннем на баль быў не дзіўным сном. Мы едзем разам у Мінск. Святлана ўпэўнена кіруе аўтамабілем. Іграе радыё, а я задумваюся над яе фразай, якую яна сказала мне падчас наведвання салона: «З дапамогай малюнка нельга перадаць тыя ўражанні ад сукенкі, якія зведваеш, калі яна на табе». Вось так і ў жыцці: па фота на вокладцы нельга меркаваць пра чалавека. За акном мільгае паказальнік «Новае жыццё», які выклікае маю ўсмешку. Цяпер я дакладна ведаю: для таго, каб нешта змяніць, трэба проста не баяцца перамен...

**Алена ДРАПКО.**

*Мінск — Смалявічы.*



*На свае вочы*

# КАМАНДА ХОЧА ПЕРАМАГАЦЬ



Фотаздымкі Надзеі БУЖАН.

**Сёння ў дацкім Военсе зборная Беларусі па хакеі правядзе свой першы матч алімпійскай кваліфікацыі. Напярэдадні старту ў адказным турніры карэспандэнт «Звязды» паспеў у Нацыянальны аэрапорт «Мінск» праводзіць айчынных хакеістаў на рэйс у Білунд, радзіму пластыкавых чалавечкаў з канструктарам «ЛЕГА».**

У аэрапорце хакей патэнцыяльных пасажыраў цікавіць, напэўна, менш за ўсё. Нехта павольна гартае глянцавыя часопісы ў кіёсках, адпачывае на канапах, а нехта наогул заблытаўся ў праходах і ўсё не можа знайсці месца, дзе адбываецца рэгістрацыя «на Рым». Па вялікім рахунку, хакейную зборную праводзілі ў Данію літаральна некалькі журналістаў з камерамі і дыктафонамі. І ўсё. Але гэта ніяк не паўплывала на настрой падапечных Андрэя Скабелкі. Тыя жартавалі з нашым фатографам і ва ўсім імкнуліся выглядаць разняволена, ненапружана. Канстанцін Кальцоў, капітан каманды, наогул прадэманстраваў перад адлётам у аб'ектыў свой пашпарт. Маўляў, знайдзіце 10 адрозненняў.

Наш коўч таксама вырашыў запасціся чытвом, аднак журналісты адразу ўзялі Скабелку ў палон.

**— Які настрой перад вылетам?**

— Працоўны, — каля газетнага шапіка традыцыйнае пытанне выклікала ў Андрэя Уладзіміравіча лёгкую ўсмешку.

**— І ўсё?**

— Безумоўна. Каманда рыхтуецца да першай гульні. Кожны разумее, навошта ён едзе ў Данію. Ёсць і хваляванне. Але як без яго? Лічу, што хлопцы знаходзяцца ў аптымальнай форме. Пэўныя тактычныя моманты нам трэба яшчэ дапрацаваць, але калектыў у нас дружны, хоча перамагаць — а гэта і ёсць самае галоўнае. Але, дзякуй Богу, усе здаровыя. Пакуль мы не разважаем пра Украіну і Данію — думаем, як згуляць першы матч са Славеніяй.

На падыходзе да рэгістрацыі паспяваем спыніць абаронцу Уладзіміра Дзянісава.

— У Данію лячу ўпершыню, — прызнаецца Уладзімір. — І асабліва нічым пра краіну не цікавіўся. Таварыскі матч з Францыяй? У ім мы адточвалі пэўныя элементы: гульню ў меншасці і большасці, тактычную схему. І для псіхалагічна-эмацыянальнага фону 4:0 — добры вынік. Ніякага непаразумення з партнёрамі не было. Мы ўжо не першы матч разам гуляем. Пра будучых сапернікаў казаць нічога не хочацца. Мы з усімі гэтымі зборнымі ўжо сустракаліся. Трэба больш канцэнтравацца на сваёй гульні. Кожная каманда імкнецца трапіць на Алімпіяду. І не трэба кагосьці дзяліць на фаварытаў і аўтсайдараў.

Між іншым мінскае «Дынама», за якое выступае Дзянісаў, у зборнай прэзентуюць адразу 9 хакеістаў. Гэта ў дадатак да рэплікі пра зладжанасць. Здаецца, менавіта дынамаўцы павінны стаць для трэнерскага штаба апорай на гэтым турніры. А таму, напэўна, нездарма Скабелку дапамагаюць трэніраваць зборную і Аляксандр Андрыеўскі, і Любамір Пакавіч, якія разам працуюць у «Дынама».

Сярод апошніх, хто праходзіць рэгістрацыю, — наш славуты ветэран зборнай Аляксей Калюжны. Сёлета ён абараняе колеры яраслаўскага «Лакаматыва». З-за тэмпературы супраць Францыі не гуляў, аднак усё роўна ляціць разам з камандай у Военс.

— Іду на папраўку, — крыху абнадзейвае балельшчыкаў Аляксей. — Але пакуль цяжка сказаць, як добра сябе адчуваю. За колькі дзён згубіў некалькі кілаграмаў. У аўторак выходзіў на лёд. Рухаюся ўжо лепш, аднак сіл стала менш. Што тычыцца сапернікаў, я не думаю, што нам трэба кагосьці баяцца. Раней мы сустракаліся з гэтымі камандамі і не ўзнікала ніякага хвалявання за вынік матча. А сёння столькі размоў, нагнятанне атмасферы... Гэта ўсё лішняе. Мне здаецца, калі згуляць у сваю сілу, мы пераможам.

**— У вас больш хвалявання за раз за здароўе ці за вынік алімпійскай кваліфікацыі?**

— За сябе я хвалююся значна менш, чым за людзей, якія разам са мной...



❑❑❑

**Змагацца за шчаслівы квіток на Алімпіяду беларусы будуць не ў Білундзе, дзе знаходзіцца міжнародны аэрапорт, а ў сямітысячным мястэчку Военс. Усе матчы адбудуцца на арэне «SE». Прапануем вашай увазе расклад гульняў з удзелам нашай зборнай:**

**7 лютага, чацвер.** Беларусь — Славенія (18.00).

**8 лютага, пятніца.** Беларусь — Украіна (19.00).

**10 лютага, нядзеля.** Беларусь — Данія (20.00).

***Трансляцыю ўсіх паядынкаў зборнай Беларусі будзе весці тэлеканал «Беларусь 2».***

**Тарас ШЧЫРЫ.**

*Конкурс*

## ЗРАБІ «КУПАЛЛЕ» ЯШЧЭ БОЛЬШ ВІДОВІШЧНЫМ!

**Міністэрства адукацыі і Магілёўскі аблвыканкам праводзяць конкурс на распрацоўку архітэктурна-дызайнерскага праекта тэрыторыі святочнай зоны свята «Купалле» («Александрыя збірае сяброў»). Яна ўключае ўчастак каля аграгарадка Александрыя, прылеглы да Дняпра каля новага аўтамабільнага моста, плошчай 4,5-5 гектараў.**

Конкурс праводзіцца сярод студэнтаў устаноў вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якія рыхтуюць спецыялістаў архітэктурна-будаўнічага профілю. Конкурсныя работы могуць выконваць студэнтамі (навучэнцамі) у рамках курсавога (дыпломнага) праектавання ці ў ініцыятыўным парадку.

Трэба добраўпарадкаваць тэрыторыю, прылеглую да аграгарадка, з мэтай правядзення там святочных мерапрыемстваў, а таксама павышэння якасці камфорту архітэктурнага асяроддзя. Фарміраванне апошняга павінна ўключаць зборна-разборную сцэну, партэр на 2,5 тысячы гледачоў, розныя святочныя элементы вулічнага дызайну і малыя архітэктурныя формы, элементы гарызантальнага і вертыкальнага азелянення, спецыяльныя віды машчэння. Аб'екты і элементы архітэктурнага асяроддзя, якія мяркуюцца да ўвасаблення, павінны лёгка трансфармавацца, быць мабільнымі і эканамічнымі. Іх запланавана выкарыстоўваць шматразова.

Канкурсантам прапануецца згадаць падчас працы пра традыцыйныя сімвалы і вобразы беларуска-га Купалля, выкарыстаць сучасныя прыёмы візуальных мастацтваў дызайну архітэктуры.

*Конкурс працягнецца да 1 сакавіка. Пераможцаў чакаюць дыпломы Міністэрства адукацыі і грашовыя прэміі ад 0,5 мільёна да 1,5 мільёна рублёў. Матэрыялы да ўдзелу дастаўляюцца не пазней 1 сакавіка (12.00) у 5-ы корпус БНТУ (навуковая бібліятэка), п.53 (метадычны кабінет) па адрасе: г. Мінск, пр. Незалежнасці, 65. Тэл.: 8 029 576 97 04 (МТС).*

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

## ЦІ ЗАГУЧЫЦЬ ВЫСОЦКІ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ?

**Конкурс творчых праектаў школьнікаў «Мая мова, мая культура, я» ўпершыню пройдзе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Яго ініцыятарам выступала Рада маладых навукоўцаў філалагічнага факультэта ўніверсітэта. Конкурс нацэлены на падтрымку таленавітай моладзі, якая цікавіцца літаратурай, культурамі і мовамі.**

Спаборніцтвы пройдуць у чатырох намінацыях: «Пераклад верша Уладзіміра Высоцкага» (на любую сусветную мову), «Рэклама сваёй любімай кнігі або «антырэклама» нелюбімай», «Эсэ «Я нарадзіўся тут» і «Эсэ «Інтэрнэт-камунікацыя: праблемы рэальнай і віртуальнай асобы». Прыняць удзел у конкурсе можа любы вучань 9—11-х класаў школы, ліцэя або гімназіі. Пры гэтым дапускаецца не толькі індывідуальнае аўтарства, але і калектыўнае. Магчымы таксама ўдзел адразу ў некалькіх намінацыях. Работы падаюцца на рускай і беларускай мовах і прымаюцца да 28 лютага. Больш падрабязную інфармацыю аб умовах удзелу ў конкурсе можна знайсці на сайце філалагічнага факультэта БДУ www.philology.bsu.by.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

*Мадэлюем будучыню!*

# ТУТ ХЛОПЧЫКІ СТАНОВЯЦЦА МАЙСТРАМІ



**Поўны прывад і хуткасць да 100 кіламетраў у гадзіну — аўтамадэлі, зробленыя рукамі юных інжынераў Рэспубліканскага цэнтра тэхнічнай творчасці здзіўляюць сваім падабенствам да сапраўдных, «дарослых» аўтамабіляў.**

Аўтамадэляванне — даволі малады від тэхнічнага спорту. Нягледзячы на гэта, ён ужо паспеў набыць велізарную папулярнасць як ва ўсім свеце, так і ў Беларусі. Юныя аўтамадэлісты будуюць мадэлі розных канструкцый, памераў і прызначэння — ад простых да сучасных трасавых і радыёкіраваных. Са сваімі мадэлямі хлопцы ўдзельнічаюць у спаборніцтвах рознага ўзроўню, у тым ліку і міжнароднага. Сярод маладых беларусаў вялікая колькасць чэмпіёнаў.



— У нашым гуртку займаюцца дваццаць два чалавекі, і гэта не толькі маленькія хлопчыкі, — распавядае **загадчык аўтамабільнай лабараторыі Дзмітрый МОСІН**. — Цяпер гурткі можа наведваць моладзь да 30 гадоў. Раней жа мы выпускалі сваіх 18-гадовых навучэнцаў, і яны сыходзілі ў «нікуды». А цяпер у іх ёсць сваё працоўнае месца, дзе хлопцы захоўваюць інструмент, мадэлі. Нашы выпускнікі з задавальненнем прыходзяць да нас па тэхнічныя парады, а таксама працягваюць удзельнічаць у спаборніцтвах, але ўжо разам з дзецьмі і жонкамі!



На занятках загадчык аўтамабільнай лабараторыі Дзмітрый МОСІН са сваімі вучнямі.

— Займаючыся мадэляваннем, навучэнцы набываюць мноства карысных практычных навыкаў, а таксама паглыбляюць тэарэтычныя веды, атрыманыя ў школе, — дадае **загадчыца спартыўна-тэхнічнага аддзела цэнтра Святлана СОСНІНА**.

І сапраўды, у гуртку хлопцы атрымліваюць карысныя веды, якія спатрэбяцца ў дарослым жыцці, бо тут не толькі вучацца трымаць у руках адвёртку, абцугі, дрыль, працаваць на розных станках. Мадэлі з электрарухавіком або рухавіком унутранага згарання ўяўляюць сабой паменшаныя копіі сапраўдных транспартных сродкаў і дэталёва паўтараюць арыгінальныя аўтамабілі. Таму хлопцы, цалкам магчыма, могуць стаць у будучым кваліфікаванымі механікамі. А яшчэ і добрымі кіроўцамі, бо дзякуючы рэалізму язды юныя інжынеры будуць гатовыя перайсці ад пульта радыёкіраваных мадэляў да кіравання сапраўдным аўтамабілем!

**Дарэчы**

*Дні адчыненых дзвярэй пад дэвізам «Юнацтва. Інтэлект. Будучыня» праходзяць у Рэспубліканскім цэнтры тэхнічнай творчасці з 1 лютага па 1 сакавіка. У гэты час маладыя мінчане змогуць наведаць выставу «Тэхна-Эвалюцыя», прысвечаную 560-годдзю з дня нараджэння Леанарда да Вінчы. Акрамя таго, будзе працаваць фотавыстава «Беларусь маладая», у якой сабрана каля 1,5 тысячы работ маладых аўтараў з усіх куткоў Беларусі.*

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**

*Людзі добрыя*

# ПАДАРЫЦЬ НАДЗЕЮ ІНШАМУ

**Жыццё часта выпрабоўвае людзей на трываласць. Зразумець, чаму так адбываецца, заўсёды цяжка. Ёсць думка, быццам нічога не адбываецца без прычыны, але ж калі пакутуюць блізкія людзі, асабліва дзеці, то раздумваць нельга — трэба змагацца і дзейнічаць, каб не ўпусціць апошнюю магчымасць...**

Дзмітрый і Ларыса Маргаевы — на першы погляд звычайная сям'я. Як многія сем'і, яны хацелі дзіця. Нарадзілася дачушка, але з'явілася яна на свет, калі мама была на сёмым месяцы цяжарнасці. Доўгі час бацькі маўчалі пра тое, што ў іх здарылася гора: Ксюшы паставілі дыягназ ДЦП. Зараз ёй 2 гады. Дзяўчынка вельмі дрэнна развіваецца фізічна — важыць толькі 7 кілаграмаў, зусім нядаўна пачала поўзаць і пераварочвацца. Хвароба прагрэсуе. Кожны дзень бацькі змагаюцца за дзяўчынку. Курсы лячэння, занняткі з масажыстам, лагапедам — усё гэта робіцца, але змены ў сітуацыі адбываюцца вельмі павольна. Арганізм дзіцяці фарміруецца няправільна.

Кантактуючы з бацькамі, чые дзеці аказаліся ў падобных сітуацыях, Ларыса і Дзмітрый даведаліся пра кітайскую медыцыну. Гэта апошняя магчымасць уратаваць дачку. Прыблізны кошт аднаго курса лячэння ў Хэйлуцзянскім універсітэце, які доўжыцца 3 месяцы, складае 12 000 еўра. А такіх курсаў неабходна 2-3 на год. Сям'я не ў стане аплаціць такое лячэнне самастойна, таму ўсе спадзяванні цяпер на тое, што знойдуцца людзі, здольныя дапамагчы.

— Мы з мужам робім усё, каб у жыцці нашай дачкі было месца для радасці, а не толькі бясконцыя практыкаванні, — кажа мама дзяўчынкі. — Сёння нам ужо ўдалося сабраць неабходную суму для першага курса лячэння, але патрэбна некалькі такіх курсаў, таму працягваем збор сродкаў.

Днямі ў Мінску быў арганізаваны дабрачынны канцэрт «Добры падарунак» з удзелам беларускіх «зорак» для збору сродкаў на лячэнне. Па словах арганізатараў, мерапрыемства прайшло паспяхова. Кожны з прысутных артыстаў і гасцей па-свойму выказаў салідарнасць з бацькамі ў барацьбе за будучыню дзіцяці.

— Тым, хто не трапляў у падобныя сітуацыі, нават у думках складана ўявіць гэтыя перажыванні, — кажа Георгій Калдун. — Я імкнуся, наколькі гэта магчыма, быць маральна разам з такімі людзьмі. Калі хоць частачка той цеплыні, якую я стараюся перадаць, дойдзе да іх, то я буду бясконца рады. У маім жыцці таксама здараліся няпростыя сітуацыі. Справа тут нават не ў спачуванні, а ў імкненні зрабіць усё, залежнае ад цябе, каб людзі ведалі, што яны не адны.

Дабрачынная група «Прасвет» — гэта розныя па роду сваёй дзейнасці і ўзроўню даходаў людзі, якія аб'ядналі мэтай дапамагаць тым, хто мае ў гэтым патрэбу.

— У нашу групу ўваходзяць і мае сябры па бізнэсе, і школьнікі, і студэнты, прадстаўнікі творчай і эстраднай сферы. Кожны прысвячае свой вольны час агульнай справе, — дзеліцца Дзяніс Касцянаў, які ўзначальвае рух. — Артыст можа прыйсці і выканаць песню, кіроўца зробіць свой уклад, калі дапаможа завезці падарункі ці нейкія рэчы ў дзіцячы дом. І спіс такіх паслуг можна працягваць доўга. Важна не забываць, што ў любога з нас ёсць магчымасць дапамагчы іншым.

Штодзённа людзі заняты працай, сям'ёй і асабістымі справамі. Таму не ў кожнага хапае часу, каб азірнуцца і знайсці тую нішу, дзе будзе карысная нават невялікая дапамога. І ў гэтым кантэксце «разгубленасці» «Прасвет» таксама імкнецца не заставацца ўбаку. «Прасветаўцы» самастойна збіраюць інфармацыю аб тым, дзе, што і каму патрабуецца. Бо аднаму патрэбны лекі, а іншаму — элементарны рамонт. А наяўнасць інфармацыі дае магчымасць хутчэй прымаць рашэнне аб канкрэтных дзеяннях. Галоўнае, каб мы не ўпусцілі гэтую магчымасць — быць карыснымі іншым.

**Алена ДРАПКО.**

**Рэквізіты для падтрымкі Ксюшы Маргаевай:**

Дабрачынныя рахункі адкрыты ў філіяле № 511 — г. Мінск, вул. Доўгабродская, 1
**УНП** 100349858, **МФО** 153001815

**— беларускія рублі** — транзітны рахунак №3819382103561 на дабрачынны рахунак №000001 у аддзяленні № 511/406

**— долары ЗША** — транзітны рахунак №3819382104993 на дабрачынны рахунак №000001 у аддзяленні № 511/406

**— еўра** — транзітны рахунак №3819382104993 на дабрачынны рахунак №000001 у аддзяленні № 511/406

**— расійскія рублі** — транзітны рахунак №3819382104993 на дабрачынны рахунак №000001 у аддзяленні № 511/406

Прызначэнне плацяжу: дабрачынны рахунак адкрыты на імя Маргаева Дзмітрыя Паўлавіча для збору сродкаў на лячэнне дачкі Маргаевай Ксеніі Дзмітрыеўны.

**Электронны рахунак:** кашалёк **EasyPay:** 26697732.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
07 02 2013 г.

Праблема сучаснасці


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# ПАДЛЕТАК І КНІГА

## Як вярнуць любоў школьнікаў да чытання?

***Я скончыла школу пяць гадоў таму. Прызнаюся, ужо тады мала хто чытаў нават творы са школьнай праграмы, не кажучы пра пазапраграмныя. А ў якіх стасунках з кнігай цяперашнія школьнікі?***

### Калі няма прыкладу бацькоў...

Выпраўляюся ў мінскую сярэднюю школу № 163. Ля кабінета рускай мовы і літаратуры бачу дзяўчыну, паглыбленую ў чытанне нейкіх раздрукоўак. Заводжу размову. Высвятляецца, што дзесяцікласніца чытае «Злачынства і пакаранне»... у скарочаным пераказе. Забыўшыся на нядаўняе ўласнае школьнае мінулае здзіўляюся: як творы Дастаеўскага можна вывучаць у скарочаным варыянце, калі і ў поўным немагчыма ўсё зразумець?.. У адказ дзяўчына толькі адмахваецца. Пытаю пра тое, што яна і яе аднакласнікі чытаюць па-за школьнай праграмай — і тут ужо бачу здзіўленне ў яе вачах: якое пазакласнае чытанне?..

Настаўніца беларускай мовы і літаратуры Вольга Печнікава прызнаецца: праблема чытання сапраўды балючая. Самастойна чытаюць толькі пяцікласнікі (ім падабаюцца народныя казкі), а таксама вучні шостых-сёмых класаў. Са старэйшымі сітуацыя горшая — яны занятыя інтэрнэтам, чытаць лянуюцца. Настаўніца ўпэўнена, што ўсё ідзе з сям'і: дзеці не прывучаны чытаць дома, бо бацькі не падаюць ім прыклад.

— Але ёсць некаторыя дзеці, якія чытаюць самі і не па праграме. У падлеткаў зараз вельмі папулярны жанр фэнтэзі, і тут другая крайнасць: часам нават даводзіцца адбіраць у іх кніжкі, бо чытаюць нават на ўроках, — распавядае Вольга Яўгенаўна.

А вось беларускую літаратуру школьнікі ўвогуле не чытаюць. Часам нават не могуць адолець праграмныя творы. І справа не ў тым, што беларускамоўныя аўтары не пішуць цікавых кніг для дзяцей. Усё значна прасцей: школьнікі сёння дрэнна разумеюць беларускую мову.

### Аўтар павінен ісці да чытача

Спрабую высветліць сітуацыю там, дзе ідзе строгі ўлік кніг і чытачоў і дзе можна прасачыць, хто якім творам аддае перавагу.

У чытальнай зале сталічнай бібліятэкі № 18 засяроджана гартаюць газеты і часопісы некалькі людзей сталага ўзросту. У чарзе да бібліятэкара — дзве жанчыны і мужчына сярэдняга ўзросту, а таксама пажылыя мужчына і жанчына. Загадчыца бібліятэкі Алена Сухадолава заўважае, што школьнікаў цяпер тут рэдка сустрэнеш.

— Сённяшняя моладзь не шукае інфармацыю ў бібліятэцы, а здабывае яе ў інтэрнэце. А тыя падлеткі, што наведваюць нашу ўстанову, прыходзяць у асноўным па кнігі па школьнай праграме, бяруць Іскандэра, Бялова. Але ў той жа час сярод школьнікаў вялікая колькасць тых, хто чытае навуковую фантастыку.

Па словах Алены Іванаўны, цікаўных да чытання хлопчыкаў і дзяўчат становіцца ўсё менш. Хоць загадчыца бібліятэкі і адзначае, што шмат падлеткаў цяпер чытаюць кнігі ў электронным варыянце, але лічыць гэтую з'яву адмоўнай, бо ніякія гаджэты не заменяць адчуванняў, што дае папяровая кніга.

— Цяпер у дзяцей няма любові да чытання. Каб яе ўзрасціць, патрэбен комплексны падыход: і выданне прыгожых кніг, і паходы ў тэатр, і сустрэчы з аўтарамі, і, самае галоўнае, чытанне бацькоў разам з дзецьмі, — пацвярджае высновы папярэдняга суразмоўцы Алена Сухадолава. І дзеліцца ўласным вопытам:

— Калі ў нас праходзіла сустрэча з Валянцінай Паліканінай, усе прысутныя дзяўчаты адразу запісаліся ў бібліятэку і разабралі творы паэткі пра каханне.

### У фаворы і казкі, і бестсэлеры

Паразмаўляўшы па настаўнікамі і бібліятэкарамі, вырашыла зазірнуць у кніжную краму. Можа, дзеці не чытаюць таму, што не могуць знайсці цікавых кніг? На паліцах у шырокім асартыменце — усемагчымыя дапаможнікі па школьных прадметах, гатовыя хатнія заданні. Пытаюся ў прадаўца: акрамя гэтага, што ў вас ёсць для падлеткаў? Высвятляецца, што ёсць і мастацкая літаратура, прычым найбольшым попытам апошнім часам карыстаюцца кнігі беларускіх выдавецтваў. Літаратуру кожны дзень набываюць як самі падлеткі, так і дарослыя для іх.

— Вельмі папулярная кніга сярод школьнікаў «Прыгоды Бульбобаў» Паўла Міська, таксама часта набываюць зборнікі аўтарскіх казак «Залаты талер», творы школьнай праграмы, — праводзіць экскурсію па кніжнай краме «Вільня» прадавец Вера Герашчанка. — Рэагуюць школьнікі і на бестсэлеры, напрыклад, зараз усе чытаюць «Машу і Мядзведзя» па матывах аднайменнага мультфільма(!).

Як бачым, не ўсе школьнікі забыліся на кніжкі і заселі ў сусветным павуцінні. Але такіх становіцца ўсё менш і менш.

### Зарабляюць віртуальна, чытаюць рэальна!

Як паведамляе сайт «Новости литературы», у Чэхіі дзеці чытаюць кнігі, падборку якіх зрабілі вядомыя чэшскія артысты. Выбіраюць кнігі для чытання школьнікі і самастойна, абмяркоўваюць спіс прапанаванай літаратуры ўсім класам.

Такую ахвоту да чытання стымулюе ўзнагарода... у памеры 50 крон, якую дзеці атрымліваюць за кожную прачытаную кнігу. Юныя чытачы праходзяць тэст на сайце праекта «Чытанне дапамагае». І калі ўсе адказы правільныя, камп'ютар пераводзіць на імя школьніка сумленна зароблены кроны. Праўда, грошы гэтыя — віртуальныя. Аднак летась дзеці «начыталі» больш чым на 11 мільёнаў крон. Выдаткаваць гэтыя грошы вучні могуць толькі на дабрачыннасць, з дапамогай электроннага пераліку сродкаў.

Так, дзякуючы такой акцыі, дзеці могуць не толькі развівацца і ўзбагачаць свой унутраны свет, але і дапамагаць абяздоленым, пералічваючы грошы на лячэнне альбо набыццё жылля. «Начытаныя» школьнікамі грошы пералічваюць афтальмалагічным клінікам і нават Цэнтру навучання сабак-павадыроў для сляпых.

А штуршком для акцыі стала вывучэнне школьнай статыстыкі ў Чэхіі, якая паказала, што большасць дзяцей у краіне выдатна ведаюць матэматыку, але пры гэтым займаюць адно з апошніх месцаў у Еўропе па чытанні кніг.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**

Добры сябар — настаўнік

# ЁН ПАКАЗАЎ, ЯК НАРАДЖАЕЦЦА «ХІМІЯ» ЦІКАВАСЦІ ДА ЖЫЦЦЯ...



***У Ліцэі БДУ — месцы, дзе амаль усе раскрываюць свае творчыя здольнасці, — незлічоная колькасць незвычайных людзей. Адзін з іх — Андрэй Кульша***

**Настаўнік хіміі, таленавіты матэматык, фізік і проста цікавы чалавек. Што незвычайнага ў ім? А хаця б тое, што бацька Андрэя вельмі рана пачаў займацца з ім матэматыкай: хлопчык дакладна ведаў лагарыфмы, а пасля прыйшоў час ісці ў першы клас, дзе дзяцей... вучылі лічыць на пальцах. Зразумела, што вундэркінд хутка засумаваў. Так і трапіў... у чацвёрты клас. Нестандартная гісторыя, згадзіцеся...**

### Дыгер

— Аднойчы вучні-хімікі запыталіся ў мяне пра моцны ліхтарык: ён спатрэбіўся ім у адным з выступленняў. Я ўзяў ды і прыцягнуў свой дыгерскі пражэктар — наўрад ці слабейшы за тыя, што ў актавай зале. Давялося трошкі распавесці пра кіламетры падзямелляў, па якіх вандруюць дыгеры — аматары ўсялякіх тэхнагенных памяшканняў ды забудоў, ніжэйшых за ўзровень асфальту, — кажа Андрэй Кульша.

У горадзе гэта звычайна розныя калектары, бункеры або аб'екты грамадскай абароны; за мяжой горада — розныя старыя ракетныя шахты, пакінутыя камандныя пункты або ваенныя склады. У гэтых незвычайных месцах, дзе ўсё зроблена чалавекам, аднак амаль што не бывае людзей, вельмі добра адчуваецца кантраст паміж штодзённай жыццёвай мітуснёй ды глыбокай пячаткай часу, які рухаецца незалежна ад нас. Калектар гучыць дзіўным рэхам, у якім чуюцца чалавечыя галасы; паволі растуць сталактыты, паўзе ржа, раптам пралятае кажан. У бамбасховішчы глыбокая цішыня, тонкі пыл на мэблі, да якой ніхто не дакранаўся дзесяцігоддзямі, а здымаеш трубку старога савецкага тэлефона — гудок...

Людзі прывыклі бачыць тое, што ім трэба. Тырчыць бетанаваны слупок з зямлі — ну, і хай сабе тырчыць. А пад ім, усяго на якіх-небудзь пятнаццаць метраў глыбей, — зусім іншы свет...

### Астраном

— Калі сястра паехала ў Бельгію, на мытні да яе нейкім чынам трапіў бінокль. Гаспадар не знайшоўся, так гэты бінокль апынуўся ў нас. У свае восем гадоў я марыў якраз пра такі. Паціху разабраўся ў оптыцы, планетах, зорках, галактыках, сабраў грошы на больш моцную падзорную трубу, а потым ужо і на маленькі тэлескопчык. Пазней праз інтэрнэт пазнаёміўся з іншымі аматарамі астраноміі ў Беларусі, мы пачалі выязджаць на астранамічныя назіранні, стварылі свой сайт belastro.net, а потым заснавалі астранамічны клуб.

На жаль, я прысвячаю астраноміі ўжо не так шмат часу, як калісьці, аднак усё ж не кінуў гэта захапленне, нягледзячы на тое, што мой першы інструмент — той самы бінокль — кудысьці знік так жа раптоўна, як і з'явіўся. Улетку, калі надвор'е больш спрыяльнае для назіранняў, ужо некалькі гадоў запар праводзіцца фестываль «БелАстраФест»; летась у ім удзельнічалі і двое нашых ліцэістаў, — гаворыць суразмоўца.

Ці шмат хто ведае, што на зорным небе можна ўбачыць амаль увесь Сусвет? Што простым вокам можна назіраць суседнія галактыкі? Хіба ж не прыемна будзе вам пазнаць Юпітэр сярод гарадскіх ліхтароў?

### Вандроўнік

— Як толькі мне споўнілася чатыры гады, мы пераехалі ў новую кватэру ў Малінаўцы. На той час гэта было самай гарадской мяжы, і з нашых вокнаў добра было відаць далёкія ўзлескі ды вёскі, старую ферму, кальцавую дарогу і велізарныя трубы ЦЭЦ-4. Мяне цягнула да іх, быццам магнітам, — хацелася апынуцца побач, убачыць тую прастору, што далей, за імі. У шэсць гадоў бацькі дазволілі заходзіць за дом, аднак не ўдакладнілі, як далёка, і я пачаў вандраваць за кіламетры ад дома...

Транспарт дае перавагу, калі табе трэба з пункта А трапіць у пункт Б. Аднак ён толькі замінае, калі цікавіць усё, што бачыш. Пешшу ты вольны выбраць любы маршрут, у любы момант змяніць кірунак, раптам перайсці поле альбо пераплыць раку. Убачыў за борам нейкую дзіўную старую хату — пайшоў да яе; знайшоў сярод ракі бязлюдны востраў — даплыў да яго. Так, аўтамабіль хутчэй, аднак ён прывязвае цябе да дарог, побач з якімі ўсё аднолькава. А найбольш цікавае ды незвычайнае — у дзікіх мясцінах, дзе людзей амаль не бывае.

### Настаўнік

А які ж, спытаеце вы, Андрэй Вячаслававіч настаўнік? Як ён увогуле трапіў у прафесію?

— Настаўнікам у школу? Ні ў якім разе! — казаў я на 5-м курсе хімічнага факультэта БДУ. З дыпломам хіміка-даследчыка мне хацелася займацца навукай і вынаходзіць новыя рэчывы. Словам, марылася пра незвычайнае, — гаворыць мой суразмоўца. — Аднак пазней, калі знаёмыя пачалі звяртацца з просьбай аб дапамозе па хіміі, раптам адчуў, што мне падабаецца тлумачыць гэтую мазаіку заканамернасцяў, разблытваць тугі «клубок» хімічных з'яў. Так я і апынуўся за настаўніцкім сталом. Сяброўскі лад жыцця Ліцэя БДУ яшчэ ў дзяцінстве запаў у душу, таму маё вяртанне ў новай якасці было сапраўдным шчасцем. За дзесяць гадоў ліцэй змяніўся вонкава: новае памяшканне, новыя традыцыі, але ж яго сутнасць засталася ранейшай — роднай, сваёй. Кожны ліцэіст — быццам даўні сябар, з кожным ёсць пра што пагаварыць, тут няма нейкіх штучных перашкод у размове. Цябе паважаюць шчыра, бо бачаць і разумеюць, хто ты ёсць. І ты сам адчуваеш такую ж павагу да ліцэістаў.

...Думаеце, гэта ўсё, што можна сказаць пра Андрэя Вячаслававіча? На самой справе, каб распавесці пра ўсе цікавыя факты з жыцця гэтага чалавека, не хопіць газетнага нумара. Таму дадам галоўнае: на яго ўроках мы вучымся яшчэ і чамусьці больш важнаму ў жыцці, чым хімія...

**Ульяна БУДЗІК.**

Нагода для ўсмешкі

# ЦНАТЛІВЫ Ў 20?



*Анкуру ДАХІЯ з Індыі цяпер 23. Ён працуе ў старэйшым выдавецтве краіны General Book Depot, спрабуе сябе ў якасці мадэлі і... пісьменніка. Апавяданні, змешчаныя на сайце маладога аўтара, ужо колькі гадоў чытачы не абыходзяць увагай, а яго дэбютны раман 20 And Still a Virgin?!!? («Яшчэ цнатлівы ў 20?!!?») стаў надзвычай паспяховым. Мяркуйце самі. Ён пабачыў свет у 2009 годзе, і за два гады разышліся ўжо тры тыражы кнігі. Больш за тое, не так даўно Анкур падрыхтаваў новую рэдакцыю рамана (у ёй час дзеяння з сучаснага зменены на мінулы), якая зусім хутка пабачыць свет. Гэты твор распавядае пра жыццё простых хлопцаў, якія сябруюць з дзяцінства, называюць адзін аднаго братамі, разам ходзяць у школу, учыняюць маленькія «злачынствы», і перажываюць першае каханне. Неўзабаве ў выдавецкім доме «Звязда» выйдзе пераклад рамана на беларускую мову. Таму знаёмцеся: Анкур Дахія і ўрыўкі з яго кнігі «Яшчэ цнатлівы ў 20?!!?».*

**— Калі ты пісаў свой раман, ці мог прадбачыць, што ён будзе настолькі паспяховым?**

— Вядома, у мяне былі пэўныя надзеі, але я ніколі не думаў, што чытачы сустрэнуць мой твор настолькі прыхільна. Шчыра дзякую ўсім ім.

**— Ці можна сказаць, што ў індыйскай літаратуры сёння існуе такая тэндэнцыя — пісаць пра моладзь?**

— Так, бо не толькі я звярнуўся да гэтай тэмы. Іншыя выдатныя аўтары таксама прысвячаюць свае творы моладзі.

**— А ці мог ты прадбачыць, што кніга будзе калісьці перакладзена на беларускую мову?**

— Мне пашанцавала трапіць на Мінскую міжнародную выставу-кірмаш... З гэтага ўсё і пачалося. Але незвычайнае ў жыцці — напэўна, таксама заканамернасць. А цяпер я з вялікай цікавасцю чакаю рэакцыі беларускіх чытачоў на кнігу.

**— А ў цэлым падарожжа ў Беларусь неяк паўплывала на твой светапогляд?**

— Безумоўна, тым больш што гэта была мая першая паездка за мяжу. Новае месца, іншая культура, мова. Да гэтага мой вопыт вывучэння свету быў абмежаваны толькі галівудскімі фільмамі *(усміхаецца)*.

**— Пасля таго, як мае сябры прачыталі пераклад некаторых частак кнігі, многія з іх казалі, што таксама мелі падобную ідэю — напісаць кнігу пра сваё жыццё. Але ўжо адмовіліся ад задумы, бо даведаліся, што ёсць раман «Яшчэ цнатлівы ў 20?!!?». Ты ганарышся тым, што здолеў адчуць агульны павеў цікавасці да тэмы?**

**— Я пішу глупствы з гумарам, не маючы пачуцця гумару. Спадзяюся, што мая кніга прымусіць вас пасмяяцца.**

— Ганаруся — не зусім правільнае слова ў гэтым выпадку. Я шчаслівы! Многія чытачы казалі мне з захапленнем, што падчас чытання адчувалі настальгію па школьных гадах. А мода і трэнды — справа часу. Я шчаслівы, што мая кніга дае чытачам нагоду для ўсмешкі.

**— У кнізе змешчаны твой электронны адрас. Ці шмат лістоў ты атрымаў ад чытачоў? Пра што яны пішуць? Можа, працуеш самы цікавы допіс?**

— Я атрымаў шмат лістоў. Большая частка чытачоў станоўча ацанілі маю кнігу, а некаторыя пісалі пра знойдзеныя памылкі ў тэксце. Па праўдзе кажучы, я ніколі не думаў, што людзі так высока ацэняць маю працу. Для мяне ўсе лісты цікавыя, і я не магу пакрыўдзіць чытачоў, вызначыўшы з іх лепшыя. Для мяне не мае значэння — чытач захапляецца маёй працай ці крытыкуе яе — абедзве рэакцыі дапамагаюць мне ўдасканальвацца.

**— А ў наступных кнігах будзе электронны адрас для водгукаў?**

— Я пра гэта не думаў. Але ў любым выпадку ў чытача будзе магчымасць выказаць сваю думку пра кнігу.

**— Дарэчы, наступная кніга... Калісьці ты казаў, што гэтае пытанне на мільён долараў. Пра што яна?**

— Гэта гісторыя чалавека, які жыве ў Англіі, ён шукае адказы на важныя для яго пытанні і выяўляе сваю сувязь з Індыяй.

**— Можна казаць, што ты плануеш працягваць сваю кар'еру як пісьменнік?**

— «Што потым?» — самае складанае пытанне для мяне. Я магу распавесці прыгожую казку «Я і мая светлая, забяспечаная будучыня», але што будзе насамрэч, ніхто не ведае. Напрыклад, хто мог прадбачыць, што мая кніга пабачыць свет за тысячы кіламетраў ад Індыі... Сапраўды, я маю намер працягваць пісаць. Апроч гэтага, працую над магістарскай дысертацыяй па псіхалогіі, яшчэ мне падабаецца чытаць філасофскія працы. Дарэчы, цяпер знаёмлюся з кнігамі выхадцаў з Беларусі братоў Ягоравых.

**— Магчыма, напішаш пра Беларусь у адной з наступных кніг?**

— Абавязкова. Гэта будзе падзякай беларусам за любоў і павагу, якія яны мне выказалі падчас знаходжання ў іх краіне. Я планую напісаць кнігу, у якой некаторыя падзеі будуць адбывацца ў Беларусі. Вой, я толькі што раскрыў таямніцу сваёй трэцяй кнігі!!! *(смяецца)*.

**— Некалькі слоў у апраўданне перад тым, як чытачы пазнаёмяцца з урыўкам з рамана «Яшчэ цнатлівы ў 20?!!?».**

— Я пішу глупствы з гумарам, не маючы пачуцця гумару. Спадзяюся, што мая кніга прымусіць вас пасмяяцца. Чакаю водгукаў. І прыемнага чытання.

**Марына ВЕСЯЛУХА**

# КАХАННЕ, СТРАШНЫЯ СНЫ І МАТЭМАТЫКА

## *Школа мадэляў, Рохтак*
## *Урок матэматыкі*

Місіс Ханна, наша настаўніца матэматыкі, чэрціць на дошцы нейкую старажытную гістарычную фігуру, якая, як кажа Рохіт, называецца «гіпербала». З іншага боку Аадарш малюе ў сшытку свае фігуры (як кажа Рохіт, гэта твар Аарці). Я сяджу паміж імі, баюся, але ў той жа час чакаю цуду, што місіс Ханна не выкліча мяне растлумачваць гэтую так званую гіп..ерба..лу.

— Хто растлумачыць графік класу? — пытаецца місіс Ханна. Некалькі рук уздымаюцца. І тут я падкрэслю, што ў кожным класе ёсць вучні, якія маюць звычку падымаць рукі, незалежна ад таго, ведаюць яны правільны адказ ці не. Гэта пэўнага кшталту вытворчы дэфект іх розуму — на кожнае пытанне яны выдаюць імгненную рэакцыю ў выглядзе ўзнятай рукі. І ведаеце што? Адзін з такіх людзей сядзіць побач са мной, і гэта містар Рохіт.

— Не, не разумныя вучні. Рэхаан, выйдзі да дошкі і патлумач, — кажа настаўніца, а я думаю, ці крыўдзіў я калі-небудзь яе дачку. Чаму заўсёды я? Пры тым, што місіс Ханна ведае: дзень, калі б я правільна рашыў хоць адно ўраўненне, мог бы быць упісаны залатымі літарамі ў гісторыю матэматыкі.

І вось я стаю каля дошкі, ці, можна сказаць, на полі бітвы, і наша настаўніца падае мне «стрэльбу» (крэйду). Мая задача — перамагчы непераможнага ворага, і нават яго імя для мяне з'яўляецца загадкай. Таму я выкарыстаў стратэгію, якая ніколі мяне не падводзіла, — узняў белы сцяг.

— Не. Ідзі і стань на сваё крэсла. Хто-небудзь можа гэта патлумачыць? — кажа яна злосна і глядзіць на клас. Я стаю на крэсле і пазіраю на аўтсайдараў. Хоць нешта ў мяне добра атрымліваецца...

Маё месца з аднаго боку дасканалае — дасканалыя лекцыі бацькоў, чаму я павінен старанна вучыцца; дасканалыя, усё новыя і новыя пакаранні місіс Ханны і, нарэшце, дасканалая змена майго рэпетытара па матэматыцы — ужо пяты раз — з надзеяй, што аднойчы ён/яна зробіць так, што я зразумею «Загадкавы свет матэматыкі».

Шмат разоў я бачыў сны пра матэматыку і місіс Ханну. Мне сніцца, нібыта я на працягу трох гадзін стараюся рашыць прыклад, і ўсё роўна атрымліваю няправільны адказ. У некаторых страшных снах я нават не паспяваю зрабіць і палову кантрольнай работы. А мой любімы сон — калі я бачу баксёрскі рынг. У адным яго куце стаю я, а ў другім — місіс Ханна. Тады я стараюся пакінуць рынг яшчэ да пачатку бою.

❑❑❑

Увесь дзень я думаў пра дзяўчыну, якую пабачыў зранку. Яна была прывабная, таму не дзіўна, што за такі кароткі прамежак часу мае думкі сталі занятымі толькі ёй. Але ў мяне ёсць і іншыя рэчы, пра якія трэба хвалявацца: набліжаюцца выпускныя экзамены, трэба думаць пра адзнакі, асабліва па матэматыцы. Дзякуючы новым матрацам, я заснуў, і сон прынёс збаўленне ад бескарысных хваляванняў.

*Я ў класе, стаю каля дошкі і ў той жа час гляджу на майго Анёла. Адна з аднакласніц, Сандзья, падыходзіць да мяне, я пачынаю з ёй размаўляць:*

*— Прывітанне, Сандзья.*

*— Прывет, Рэхаан, як справы?*

*— Добра, а ты як?*

*— Таксама нармальна.*

*— Слухай, а ты яе ведаеш?*

*— Каго?*

*— Вунь тую дзяўчыну, што сядзіць адна на перадапошняй парце ў першым радзе.*

*— А, так, яе завуць Камана.*

— Камана! — крычу я і прачынаюся. На гадзінніку 6.45, ужо трэба збірацца ў школу.

О, гэта быў дзіўны сон. Чорт, што са мной адбываецца. Я толькі ўчора яе пабачыў, і гэтая дзяўчына мне ўжо прыснілася. Як было яе імя? Камана... Ніколі не чуў такога дзіўнага імя.

Сёння я прыйшоў у школу на паўгадзіны раней і прабавіў увесь гэты час, гледзячы на прыгожых дзяўчат і ўслаўляючы Бога за тое, што місіс Ханна сёння не прыйдзе ў школу...

О божа! Дзяўчына, якую я бачыў учора, цяпер на баскетбольнай пляцоўцы, і яна набліжаецца да кабінета мастацтвазнаўства.

— Дарэчы, ты знаёмы з той дзяўчынай? Вунь той, яна на баскетбольнай пляцоўцы, — паказаў я на майго «Анёла».

— Так, яе завуць Камана. Яна з 10-га «Б».

Жыццё поўнае сюрпрызаў, але гэты — надзвычайны. Як я мог прысніць яе імя? Ці мой сон быў Прароцтвам, ці гэта Знак, які мне пра штосьці паведамляе? Але што б гэта ні было, думаю, я павінен з ёй пагутарыць. І няхай лёс кіруе машынай майго жыцця.

На перапынку я сядзеў у сталоўцы з Аадаршам, а Рохіт пайшоў набыць нам штонебудзь паесці і праз некалькі хвілін далучыўся да нас, несучы тры гамбургеры...

Я распавёў ім усю драматычную гісторыю пра маю першую сустрэчу з Каманай і пра свой сон.

— Ха-ха, я ж вам казаў, што з ім нешта не так, але вам было ўсё роўна. Гэй, а вось і мой таматны соус, — смяецца Аадарш, рушыць да суседняга століка і забірае бутэльку.

— Прабачце, але ён мне патрэбен, — кажа Камана Аадаршу. Яна з сябрамі якраз сядзіць за столікам, на якім Аадарш знаходзіць нейкія сляды кетчупу ў бутэльцы.

— Пасля мяне, дарагая, — кажа Аадарш і, не слухаючы яе, забірае бутэльку са стала. Яна глядзіць на нас.

— Халера, гэтая тоўстая дупа праглынула ўвесь кетчуп з бутэлькі. Ну, ты нешта распавядаў пра Каману і свой сон? Пакажаш мне гэтую шчаслівую? — пытаецца Аадарш і дзеліцца з намі тымі апошнімі кроплямі соусу.

— Ты прыдурак, тая «тоўстая дупа», у якой ты толькі што адабраў бутэльку з соусам, і ёсць Камана.

— А я падумаў, што гэта нейкая новая настаўніца ў школьнай форме, — смяецца Аадарш... Да дзіўнага смеху Аадарша далучаецца Рохіт (у яго ў роце яшчэ застаецца кавалак гамбургера).

Людзі дзіўныя. Адзін тоўсты дзядзька абражае дзяўчыну такой жа камплекцыі. Яна не тоўстая, замест гэтага яе можна назваць «кроў з малаком»...

— Ну, і што далей? — пытаецца Аадарш.

— Не ведаю. Думаю, мне трэба пагаварыць з ёй. У любым выпадку я не буду катаваць сябе, як гэта робіш ты ў выпадку з Аарці... — контратакую я.

**Пераклад з англійскай мовы Марыны ВЕСЯЛУХІ.**

*SEX—БАЛЯСЫ*

# НЕ ДАРАВАЛІ Б! КАБ НЕ КАХАЛІ...

**«Прыбіў бы, далібог, прыбіў бы! Каб не кахаў!» Гэта цытата ад хлопца, якому жонка напачатку наступіла ў транспарце на нагу, потым, ужо дома, разоў пяць запар чымсьці гучна бразнула, а ў дадатак ледзь не перакінула на яго кубак кавы. «Прыбіў бы, каб не кахаў!» — пераказала словы сужэнца жанчына і дадала, што пасля іх яны перайшлі да высвятлення: і за што ж, уласна, хлопцы і дзяўчаты кахаюць адзін аднаго? Што даруюць і што церпяць? Чым там усё ў выніку скончылася — не ведаю. Таму я прапаную пагаварыць на вышэйназваную тэму, бо якраз падобныя дробязі найчасцей служаць прычынай канфліктаў паміж ім і ёй. Прыгадаем тыповыя?**

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.



Вось чым найперш бываем незадаволеныя мы? Вядома, вашымі шопінгамі! Як столькі часу можна аддаваць гэтаму працэсу? Вы нас не разумееце, крыўдуеце... А між тым вучоныя (ну як без іх?) вызначылі: мозг мужчыны вытрымлівае толькі 40 хвілін блукання па краме. Далей папросту адключаецца. І гэта — навуковы факт. Вось патлумачце мне наступную сітуацыю. «Пайшлі, я пакажу табе месца, дзе мінулы раз купіла сабе добрую рэч». Якую карысную інфармацыю атрымаў мозг мужчыны — істоты, лагічнай па сваёй сутнасці, у адрозненне ад эмацыянальнай жанчыны? Што калісьці недзе было штосьці набыта? Якім чынам гэтыя звесткі могуць быць карыснымі цяпер?!.

**«Пайшлі, я пакажу табе месца, дзе мінулы раз купіла сабе добрую рэч». Якую карысную інфармацыю атрымаў мозг мужчыны — істоты, лагічнай па сваёй сутнасці, у адрозненне ад эмацыянальнай жанчыны? Што калісьці недзе было штосьці набыта?**

Пра самі пакупкі і гаварыць не варта. Усе ж ведаюць «класіку жанру» — анекдот пра «няма чаго насіць і няма месца ў шафе»? А як апранаецца мужчына? Што першае вывалілася з адчыненай шафы, у тым і пайшоў. Дарэчы, толькі жанчына можа апрануцца, нафарбавацца, падысці да дзвярэй, зірнуць у люстэрка і... пайсці цалкам змяняць увесь касцюм. Перафразуючы жарт вясёлых і знаходлівых, пра мужчын гэта можна сказаць, напэўна, толькі ў адзінай сітуацыі: «Ты чаму ў футболцы з лагатыпам не свайго футбольнага клуба?» — «Ды нічога чыстага больш не было!» А пра жанчын даводзіцца гаварыць зноў жа словамі анекдота: «Даражэнькая, колькі гадзін на зборы табе патрэбна, каб праз 30 хвілін ты была гатовая?»

Вось што яшчэ большасць з нас не разумее ў вашых паводзінах, дык гэта зборы ў дарогу. Нам сабрацца — толькі падперазацца. У вас жа працэс адбываецца грунтоўна, нават калі гаворка ідзе пра паездку за горад. А ўжо калі далей... Чуў гісторыю, як пара паехала на выхадныя ў Кіеў, і дзяўчына прыхапіла з сабой... паўнюткі чамадан адзення. Увогуле, нават звычайная дамская сумачка па сваёй умяшчальнасці не саступае заплечніку дэсантніка. А запас касметыкі сярэднестатыстычнай прадстаўніцы жаночага полу можна смела параўноўваць з арсеналам узбраенняў якой небудзь слабаразвітай краіны. Што, не так?.. Добра, пагаварылі трохі — і суцішымся па-джэнтэльменску. Трэба ж і вас паслухаць.

Вось якія вашы папрокі найперш на наш адрас? Ну, вядома — шкарпэткі! Яны параскіданы, дзе толькі можна, як вы лічыце. Шкарпэткі не вінаватыя: гаспадар сказаў ляжаць, яны і выконваюць. А калі сур'ёзна, адкрыю тайну: абыходзіцца так са шкарпэткамі мужчына дазваляе сабе ў прысутнасці толькі адной жанчыны, Той адзінай, якую ён лічыць сваёй і якая асацыюецца ў яго з утульным домам. Дык што, папрокаў больш не будзе?..

Другая пастаянная праблема, якая можа давесці да сутычкі — сядзенне ўнітаза, якое трэба падымаць. Ну і трапляць у цэль, зразумела... Дзяўчаты, дазвольце вам нагадаць, што калісьці мужчына ўяўляў сабой касматую істоту, якая ў лясным гушчары арыентавалася не столькі на зрок, колькі на органы нюху. Па паху можна было даведацца пра моц і здароўе магчымага саперніка. Вось і даводзілася пазначаць тэрыторыю як мага большую па плошчы... І які ж нашчадак магутных продкаў пазбавіць сябе сёння такога задавальнення. А гараж, у які мы ходзім? А паляванне, рыбалка, мабільнікі-камп'ютары? Тут пытанне фактычна гучыць так: а ці не любіць ён гэта ўсе разам ці па частках больш, чым мяне? Ну што тут скажаш? Давядзецца, напэўна, зноў прыгадваць касматага продка мужчыны, які жыў на ўлонні прыроды. У яго нашчадкаў спрацоўвае спадчынная памяць: трэба здабыць маманта, уладкаваць пячору, вырабіць узброю — толькі ў цяперашняй версіі. Таму сучаснага прадстаўніка моцнай паловы чалавецтва трэба хаця б раз-пораз выпускаць за парог кватэры. Каб не атрымалася, як у тым анекдоце. Сядзіць мужчына, на паплавок пазірае. Гадзіну сядзіць, дзве... Тут у ванны пакой заглядвае жонка і кажа: «Вызваляй ванну, і едзь ужо на сваю рыбалку. А то мне бялізну мыць трэба!». Як бачым, самае лепшае — падтрымаць захапленне свайго выбранніка. Прычым — своечасова.

Тут у тэму кароткую гісторыю раскажу. Зараз многія «падселі» на нашу беларускую камп'ютарную гульню «Свет танкаў», якую ведаюць ва ўсім свеце. Дарэчы, гэта таксама прычына для папрокаў некаторых дзяўчат: маўляў, як гэта можна — ледзьве не суткамі «секчыся»?!. Дык вось адзін хлопец узяў і... заахвоціў сваю спадарожніцу. І цяпер яны ўдваіх — кожны на сваім камп'ютары — «рэжуцца ў танчыкі». Добра гэта ці не, меркаваць не буду. А вось тое, што цяпер у той сям'і лад і згода — факт.

...Гаварыць на тэму заган адзін аднаго можна і далей. Толькі сутнасць ад гэтага не зменіцца. Справа ж не ў саміх недахопах, а ў жаданні і ўменні іх не заўважаць. Ці прыстасоўвацца да іх. Жыццё сведчыць, што перарабіць чалавека цалкам «пад сябе» немагчыма. Каханага трэба імкнуцца прымаць такім, які ён ёсць, з усімі яго магчымымі хібамі. Усё гэта разам, нібы тая мазаіка, і складае наш агульны свет. Гэта калі, як было сказана, кахаеш...

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

*У чым сіла, сястра?*

# АДЗІН З ЭТАЛОНАЎ ДЗЯВОЧАЙ ПРЫГАЖОСЦІ — ДОЎГІЯ ВАЛАСЫ

**Касметыка, абутак на высокім абцасе, моднае адзенне і розныя ўпрыгажэнні ў выглядзе бранзалетаў, пярсцёнкаў і ланцужкоў — усё гэта штодзённа жанчыны ўсяго свету выкарыстоўваюць, каб адрознівацца адна ад адной і мець пры гэтым нейкую іскрынку ў сваёй знешнасці. Яшчэ адзін з важных элементаў «пазла прыгажосці» — доўгія валасы. Сёння шматлікія прадстаўніцы прыгожага полу прыходзяць да высновы, што доўгія валасы — гэта яшчэ і модна. Даўжыня валасоў — невычэрпная тэма для сварак паміж маці і дачкой, а ў інтэрнэце гэтаму прысвечаны не адзін блог. Калісьці і ў мяне былі валасы ніжэй пояса. Зараз яны значна карацейшыя, але гэта не значыць, што я супраць доўгіх валасоў. Проста не заўсёды атрымліваецца вырасціць іх густымі і здаровымі. Бывае, што даводзіцца змагацца за такую прыгажосць не адзін год...**

## Жыццёвы вопыт

Сваёй гісторыяй змагання вырашыла падзяліцца студэнтка Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта Наталля Дзенісовіч. Не раз яе калісьці блыталі з хлопцам з-за кароткай стрыжкі. Хоць і не хутка, але прайшоў той час, і цяпер яна можа пахваліцца шыкоўнай доўгай касой.

«З дзяцінства ў мяне былі доўгія валасы. Спачатку яны былі густымі і прыгожымі. Мама любіла рабіць мне розныя прычоскі, фантазіраваць з валасамі. На жаль, з цягам часу мае валасы сталі больш рэдкімі і пасекліся на кончыках. Таму не было іншага выбару, акрамя як падстрыгчыся. Спачатку зрабіла карэ, а потым наогул пастрыглася вельмі коратка: пад хлопчыка (мне тады было гадоў 9). Ужо ў старэйшых класах пачала думаць аб прычосцы на выпускны вечар. Не спрачаюся, можна і з кароткімі валасамі зрабіць прыгожую прычоску, але вельмі ж хацелася мець доўгія. На здзіўленне, валасы вельмі хутка адраслі. Пры гэтым былі вельмі густымі. Потым я стала здзіўляць сяброў разнастайнасцю прычосак, было цікава плесці розныя віды косак. Каб добрае ўражанне захоўвалася даўжэй, я стараюся сачыць за сваімі валасамі: падбіраю для іх патрэбны шампунь, рэдка карыстаюся лакам, пенкай і падобнымі рэчывамі. Многія дзяўчаты яшчэ фарбуюць валасы, чаго б я таксама не раіла рабіць. Вось у мяне — натуральны колер валасоў, і, на мой погляд, так яны выглядаюць больш прыгожымі. А зімой трэба абавязкова насіць шапку! Бо мароз і вецер нашым валасам супрацьпаказаны. З асабістага вопыту я раю дзяўчатам абавязкова расціць валасы. Бо гэта не толькі прыгожа, але і вельмі па-жаноцку!»

## Слова прафесіянала

Хто, як не цырульнік, ведае больш пра валасы і іх уладальнікаў? Аксана Курашэвіч — прафесіянал з вялікім вопытам і стажам. Ахвотнікаў «даручыць» свае валасы рукам добрага майстра знаходзіцца нямала. Для яе валасы — нібы жывыя, і яна сапраўды ведае іх характар.

— Часта сярод цырульнікаў можна пачуць прыказку: доўгі волас — кароткі розум. Аднак гэта зусім не так. Таксама ёсць народная прыкмета: калі валасы ў дзяўчыны ўюцца, то і характар у яе, як той казаў «палец у рот не кладзі». На сённяшні дзень доўгія валасы — гэта хутчэй адпаведнасць тэндэнцыям моды. Справа ў тым, што мода на доўгія валасы зноў з'явілася гадоў пяць таму, і сёння яны, найперш, і натуральнага колеру, лічацца стыльнымі.

— Справа ў тым, што вельмі многія маці лічаць сваіх дачок «маленькімі лялькамі», а яны, як вядома, павінны быць з коскамі і ніяк інакш. І часта, пакуль дзяўчынка ходзіць у школу, яна не распараджаецца сваімі валасамі. Як маці лічыць правільным, так і будзе. Таму вельмі часта дзіця адаптуецца да пэўнай даўжыні валасоў, прывыкае да хвосцікаў, косак і розных заколак. Пазней, у большасці выпадкаў, калі дзяўчына вырастае і адрываецца ад бацькоў, пачынаюцца шматлікія эксперыменты з прычоскай. І ўрэшце, у гадоў дваццаць пяць, яна прыходзіць да высновы, што няма больш прыгожай і прывабнай прычоскі, чым доўгія і распушчаныя валасы.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## Узросту — сваю прычоску?

— Чым больш жанчыне гадоў, тым карацейшая павінна быць стрыжка. Доўгія і распушчаныя валасы ў жанчын пасля трыццаці пяці гадоў — на мой погляд, гэта занадта. Стрыжка змяняе ўсё. Знешні выгляд становіцца больш дагледжаным, твар больш адкрытым. Гэта, несумненна, амалоджвае. Ды і даглядаць іх становіцца прасцей.

— Для догляду доўгіх валасоў трэба выдаткаваць нямала сіл, часу і сродкаў. У такім выпадку, на ваш погляд, што або хто з'яўляецца штуршком для адрошчвання валасоў у дзяўчат? — пытаюся ў майстра.

## Інтэрнэт-парады

Часта шыкоўныя валасы зусім не падарунак прыроды, а вынік правільнага і рэгулярнага догляду. Пры адсутнасці правільнага штодзённага догляду ніякая лячэбная маска для валасоў, якая выкарыстоўваецца час ад часу, не дапаможа. У такім выпадку можна звярнуцца да методыкі нашых бабуль — штодзённага расчэсвання іх драўлянай расчоскай знізу ўверх, мыцця дажджавой вадой з малочнай сыроваткай, апалосквання адварам рамонку ці воцатам, сушкі натуральным спосабам і пляцення ў косы. Сёння ў арсенале жанчын шмат эфектыўных сродкаў і спосабаў догляду валасоў, але, нягледзячы на гэта, многія з іх толькі мараць мець такія ж валасы, якімі яны былі ў жанчын паўстагоддзя таму, і толькі рэдкія шчаслівкі могуць зараз пахваліцца шыкоўнымі і доўгімі валасамі.

Адзін з самых важных нюансаў — мыццё валасоў. Па-першае, важна правільна падабраць шампунь, які падыходзіць менавіта вашаму тыпу валасоў. Па-другое, пасля мыцця ім карыстайцеся бальзамам або кандыцыянерам, каб валасы былі гладкімі і добра расчэсваліся. Адно з асноўных правіл догляду — нельга мыць валасы занадта гарачай вадой, гэта вельмі іх псуе і нават можа служыць прычынай выпадзення. Яшчэ адна парада — гэта адмова ад выкарыстання тэрмабігудзі, плоек, выпрамнікоў ці хаця б максімальнае змяншэнне іх ужывання. Правільнае харчаванне — найважнейшы элемент у прыведзеным ланцужку. Штодзённы догляд валасоў прадугледжвае рэгулярнае і беражлівае да іх стаўленне. Калі ўвесці ўсе вышэйпералічаныя парады ў звычку, то догляд валасоў не здасца такой ужо складанай справай...

**Ганна БУРАК.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»;
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

Галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Наталля КАРПЕНКА.

Адрас рэдакцыі:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактны тэлефон: 292 44 12.
e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013,
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 25.227.
Нумар падпісаны ў 19.30 6.02.2013 г.

■ Экслібрыс «Звязды»

# КОЛАСАЎ ЛЮСТРАДЗЁН

Мушынскі М. Летапіс жыцця і творчасці Якуба Коласа / М. І. Мушынскі; навук. рэд. А. М. Макарэвіч. — Мінск: Беларус. навука, 2012. — 1127 с.

Кніг на беларускай мове, дзякуй Богу, хапае. Іх стала так шмат, што трапляюцца і кепскія. Але сёння мы пра кепскае гаварыць не будзем. Пагаворым лепш пра тыя лакуны, якія існуюць у гуманітарыстыцы, а найперш у літаратуразнаўстве.

Адной з такіх лакун, бясспрэчна, з'яўляецца гісторыя літаратуры ХХ стагоддзя. Нягледзячы на тое, што само стагоддзе адышло параўнальна нядаўна, так званыя літаратурныя факты збольшага паспяхова забыліся. Што ўжо казаць пра падзеі стагадовай даўніны, пра нашаніўскую пару, а таксама бурапенныя 1920-я... Уяўленне пра тыя часы сёння складаецца з штампаў і клішэ, пэўнага набору імёнаў, абавязковых гістарычных рэверансаў і кніксенаў. Рэгулярнае даследаванне біяграфій творцаў і агульнага фону літаратурнага руху практычна не вядзецца. Як вынік — занепад культуры каментарыя і апакаліптычныя чаканні.




Бадай, найшчаслівейшае выключэнне ў гэтым плане — Якуб Колас. Па-першае, хоць адмысловыя зборнікі «дакументы і матэрыялы», «публікацыі і паведамленні» не выдаюцца і ў коласазнаўстве, аднак іх паспяхова падмяняюць матэрыялы штогадовых «Каласавін». Па-другое, Коласу неверагодна пашанцавала з даследчыкамі. Супрацоўнікі музея, акадэмічныя вучоныя, нашчадкі дзядзькі Якуба пастаянна выступаюць у друку, дэманструючы ўсім ахвотным свежазнойдзеныя цікавінкі з жыцця Песняра, новыя лісты, аўтографы і іншыя праявы сіндрому Экермана.

Лагічным вынікам гэтай шматгадовай інтэнсіўнай працы сталася другое выданне «Летапісу жыцця і творчасці Якуба Коласа» М. Мушынскага.

У дужках трэба адзначыць, што біяграфічных кніг пра беларускіх класікаў вельмі мала, а тыя, што ёсць, у лепшым выпадку заснаваныя на тых жа старых штампах, якія непазбежна ператвараюць жывога літаратара ў бронзавую статую работы Заіра Азгура. У горшым выпадку — гэта набор аддаленых інтэрпрэтацый і гудкоў сапсаванага тэлефона.

На тле адсутнасці біяграфій неблагой заменай бачыцца «Летапіс жыцця і творчасці»: дзень за днём у ім тчэцца жыццё класіка — факты, факты і нічога, акрамя фактаў (прыкладна гэтаксама, як дасканалую біяграфію, можна чытаць і вядомыя кнігі Верасаева пра Пушкіна і Гогаля, нягледзячы на адсутнасць у гэтых фаліянтах тэксту самога Верасаева).

Тое, што акумуляваць дасягненні коласазнаўства за апошнія 30 гадоў давялося Міхасю Мушынскаму, зразумела. Ён займаецца Коласам пяцьдзясят гадоў, як тэкстолаг ён рыхтаваў зборы твораў класіка за апошнія паўстагоддзя, ён — аўтар сотні артыкулаў пра творчасць Коласа і чатырох кніг пра яго. Адна з гэтых чатырох — ЛЖіТ (так звычайна скарачаецца «Летапіс жыцця і творчасці») Якуба Коласа (1982). Як бачым, летась усяго толькі было здзейснена перавыданне. Аднак не ўсё так проста.

Асноўнае — аб'ём кнігі павялічыўся ўдвая. Было 543 старонкі, стала 1127. Гледзячы на такую таміну і ўзважваючы яе ў руцэ, нельга не ўразіцца. Але знаёмыя з дасягненнямі жанру ЛЖіТ палохацца не стануць. Дастаткова прыгадаць ЛЖіТ Сяргея Ясеніна ў 5 тамах выдадзеныя ў Маскве, альбо такі ж пяцітомнік пра Герцэна (1974—1990). Па вялікім рахунку, аднатомныя ЛЖіТ сёння выдаюць рэдка. Гэта — з'ява мінулых часоў. Можна, вядома, успомніць класічную працу Гусева пра Льва Талстога (1936) альбо такую ж 900-старонкавую кніжку Гітовіч пра Чэхава (1955), аднак сёння ніхто ўжо падобнымі рэчамі не займаецца. Напрыклад, сучасны Т.2 ЛЖіТ Чэхава ахоплівае няпоўныя два з паловай гады жыцця рускага празаіка (1889 ? красавік 1891). Складальнікі, відавочна, нікуды не спяшаюцца.

Цікава ў гэтым плане параўнаць дасягненні ў жанры рускага ЛЖіТ і працу Мушынскага. Нельга не заўважыць, што межы гэтага жанру ў апошні час размываюцца амаль гэтаксама, як у жанрах паэтычных ці празаічных. Калі ўзяць ЛЖіТ Ясеніна, то адразу відаць, што складальнікі паставілі сабе за мэту «сказаць усё»: амаль цалкам тут друкуюцца не толькі лісты ці мемуары, але і артыкулы пра Ясеніна, прычым вучоныя стараюцца ахапіць як мага большы аб'ём перыёдыкі. У выніку ЛЖіТ ператвараецца з храналогіі жыцця пісьменніка ў сінтэтычны твор, які сумяшчае ў сабе элементы дзвюх серый «Імярэк у літаратурнай крытыцы» і «Імярэк ва ўспамінах сучаснікаў». Бясспрэчна, кніга Мушынскага далёкая ад падобных эксперыментаў. Аднак пэўная розніца выданняў «Летапісу» 1982 і 2012 гадоў відавочная.

